ЛІМ

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 43 (5148) 29 кастрычніка 2021 г. ISSN 0024-4686

16+

Галактыка паміж радкамі стар. 6

Глыбіня лірычнай абстракцыі стар. 12

Тонкі настрой душы стар. 13

Скрозь час і прастору — да гледача

Удалёкім 1987 годзе — часе, споўненым нястрымнымі памкненнямі і неверагоднымі адкрыццямі — дзясятак тэатральных акцёраў краіны з розных, што называецца, казённых установ пакінулі свае родныя падмосткі, каб па ўласным разуменні і фактычна на пустым месцы стварыць новы тэатр. На думку тых адчайных вальнадумцаў, Мельпамена павінна была не прыслужваць бюракратычнай машыне, а заступацца за мастакоў… Так на свет і з'явіўся тэатр-студыя «Дзе-Я?».

Наступныя пяць гадоў адзначыліся для новаспечанага арт-аб'яднання надзвычай плённай творчасцю: наватарскія падыходы прынеслі калектыву пад кіраўніцтвам рэжысёраў Міколы Трухана і Віталя Баркоўскага прызнанне ў «прасунутых» культурных колах. Але адначасова з тым пяць гадоў бадзянняў прывялі стваральнікаў да думкі, што нейкі храм багінізаступніцы ўсё ж такі патрэбны. Храм, на алтар якога адданыя прыхільнікі маглі б ускладаць прынесеныя дары, шануючы сваю музу…

У 1992 годзе калектыў студыі (адной з некалькіх дзясяткаў, якія існавалі ў той час) быў удастоены статусу гарадскога тэатра. Пачаўся новы этап у гісторыі: свой дах над галавою, дзяржаўнае фінансаванне, упэўненасць у заўтрашнім дні, у рэшце рэшт, пасезонная праца… Менавіта ад гэтага моманту і вядзе свой адлік Новы драматычны тэатр, які атрымаў актуальную назву на пачатку нулявых гадоў. Цяпер жа на сцэне ўстановы поўным ходам ідзе трыццаты, юбілейны, сезон!

Працяг на стар. 5 ▸

Сцэна з прэм'ернага спектакля «Вадэвілі» пастаноўшчыцы Лізаветы Машковіч.

«ЛіМ»-акцэнты

Узнагароды. Больш за 50 прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці ўдастоены дзяржаўных узнагарод і Падзякі Прэзідэнта Беларусі. Ордэнамі, медалямі і ганаровымі званнямі адзначаны 33 дзеячы. Адпаведны ўказ падпісаў 25 кастрычніка Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. У ліку тых, хто адзначаны медалём Францыска Скарыны, — старшыня Мінскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Святлана Быкава. На падставе ўказа прысвоены ганаровыя званні Рэспублікі Беларусь: артысту-вакалісту (салісту) вышэйшай катэгорыі Нацыянальнага акадэмічнага аркестра сімфанічнай і эстраднай музыкі Дзмітрыю Качароўскаму, акцёру драматычнага тэатра і кіно, вядучаму майстру сцэны Брэсцкага акадэмічнага тэатра драмы імя Ленінскага камсамола Сяргею Пяткевічу, артыстам балета Дзяржаўнага акадэмічнага ансамбля танца Вользе Галавач і Юліі Галавіной — «Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь»; мастаку-скульптару, прафесару кафедры скульптуры Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў Аляксандру Фінскаму — «Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь»; старшыні Гомельскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Уладзіміру Гаўрыловічу — «Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь».

Віншаванне. Прэзідэнт Беларусі павіншаваў народную артыстку БССР Любоў Каспорскую з юбілеем. Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што за гады актыўнай прафесійнай дзейнасці яна ўнесла значны ўклад у фарміраванне і развіццё нацыянальнай вакальнай школы. «Слоў шчырай падзякі заслугоўвае ваша педагагічная праца. Трэць стагоддзя вы прысвяцілі выхаваўчай рабоце, перадавалі свой багаты вопыт таленавітай моладзі, якая дастойна працягвае нашы найлепшыя творчыя традыцыі, — гаворыцца ў віншаванні. — Ваш уклад у захаванне і развіццё музычнай спадчыны з'яўляецца ўзорам самаадданага служэння мастацтву».

Абмеркаванне. Міжнародны фестываль мастацтваў «Славянскі базар у Віцебску» ў 2022 годзе плануецца правесці з 14 да 17 ліпеня, паведамляе БелТА. Аб гэтым паведаміў журналістам намеснік прэм'ер-міністра Ігар Петрышэнка перад пасяджэннем арганізацыйнага камітэта па падрыхтоўцы і правядзенні гэтага мерапрыемства. Падведзены вынікі сёлетняга фестывалю і абмеркавана падрыхтоўка да наступнага. Намеснік прэм'ер-міністра паведаміў, што ў 2022 годзе, акрамя традыцыйных мерапрыемстваў фестывалю, вялікую ўвагу ўдзеляць музычным конкурсам сярод маладых выканаўцаў і дзяцей. «У полі зроку будзе грунтоўная падрыхтоўка нашых канкурсантаў, якія павінны прадстаўляць інтарэсы краіны ў рамках гэтага міжнароднага конкурсу», — адзначыў Ігар Петрышэнка. Таксама найважнейшым элементам з'яўляецца падрыхтоўка інфраструктуры горада і новых праектаў для прыцягнення маладзёжнай аўдыторыі.

Праект. Фотапраект «Беларусь — Радзіма», прысвечаны старшынству Рэспублікі Беларусь у СНД і Году народнага адзінства, прэзентавала нацыянальнае прадстаўніцтва Міждзяржаўнай тэлерадыёкампаніі «Мір» у Беларусі. У штаб-кватэры СНД у Мінску адкрылася ўнікальная выстаўка фатаграфій, зробленых слухачамі Радыё «Мір» і гледачамі тэлеканала «Мір». Гэта партрэт нашай краіны, сабраны, як мазаіка, з любімых мясцін слухачоў і гледачоў тэлерадыёкампаніі «Мір». За кожным здымкам — асабістая гісторыя чалавека, які нарадзіўся і жыве ў Беларусі. На 17 стэндах размясціліся найлепшыя фота, якія былі дасланы ў рэдакцыю на працягу летніх сезонаў 2020 і 2021 гадоў. У выніку ўдалося сабраць калекцыю з 7 тыс. фатаграфій розных жанраў і зместу. Самыя яркія і арыгінальныя з іх прэзентуюць на экспазіцыі, інфармуе БелТА.

Нагода. Тэматычная выстаўка з нагоды 455-годдзя прыняцця Статута Вялікага Княства Літоўскага 1566 года адкрылася ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі. У лістападзе 1551 года вялікі князь Жыгімонт Аўгуст даў згоду на стварэнне заканадаўчай камісіі ў мэтах удасканалення Статута 1529 года. Кіраўніком камісіі стаў Мікалай Радзівіл Чорны, работа над Статутам доўжылася больш за дзесяць гадоў. Другі Статут налічваў 14 раздзелаў і 267 артыкулаў. Дакумент напісаны на беларускай мове, зразумелай простаму насельніцтву, некалькі разоў перакладаўся на лацінскую, польскую, нямецкую, рускую і іншыя мовы. Вядомы 58 рукапісных тэкстаў Статута. Ён доўгі час служыў прыкладам і ўзорам сістэматызацыі заканадаўства, адзначаюць у НББ. Многія палажэнні дакумента апярэджвалі час і мелі выразны праграмны характар, арыентаваны на будучыню, што выводзіла яго ў лік самых прагрэсіўных еўрапейскіх законаў свайго часу.

Памяць. Інтэрактыўная выстаўка «Партызаны Беларусі», якая працягвае падарожжа па ВНУ краіны, адкрылася ў БНТУ, паведамляецца на сайце Міністэрства інфармацыі. Выстаўка заснавана на дакументах аднайменнага інтэрнэт-праекта Выдавецкага дома «Беларусь сегодня» і Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, фотаматэрыялах Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў. «Партызаны Беларусі» — аб'ектыўная гісторыя, дзе няма месца здагадкам, фальсіфікацыі і падвоенай трактоўцы, бо ў аснове выстаўкі — архіўныя дакументы, сведчанні, фатаграфіі. Гэтая, па сутнасці, электронная энцыклапедыя жыцця партызан і падпольшчыкаў з'яўляецца адзінай падобнай на ўсёй постсавецкай прасторы. Па меркаванні рэктара БНТУ Сяргея Харытончыка, заканамерна, што памяць з цягам часу будзе сцірацца, бо пакаленне відавочцаў сыходзіць. Таму моладзі трэба нагадваць, што перамогу кавалі менавіта іх дзяды і прадзеды.

Агляд афіцыйных падзей ад Інесы ПЕТРУСЕВІЧ

у Саюзе пісьменнікаў Беларусі

У падтрымку туркменскага мысляра

У Саюз пісьменнікаў Беларусі звярнулася Пасольства Туркменістана ў Рэспубліцы Беларусь з просьбай падтрымаць ініцыятыву аб уключэнні імя вялікага мысляра туркменскага народа Махтумкулі Фрагі ў рэестр праграмы ЮНЕСКА «Памяць свету». СПБ з вялікай цікавасцю паставілася да гэтай прапановы.

— Імя Махтумкулі Фрагі добра вядома ў Беларусі, — заўважае першы намеснік старшыні СПБ Алена Стэльмах. — Яго філасофскія разважанні аб лёсах людзей не страцілі свайго значэння ў часе, яны актуальныя і ў сучасным жыцці.

Класік туркменскай літаратуры Махтумкулі Фрагі сёння застаецца светачам, які вызначае духоўны шлях не толькі для свайго народа. Напісанае ім многа стагоддзяў таму мае вялікае значэнне, у тым ліку для прымнажэння духоўных каштоўнасцей беларусаў.

Саюз пісьменнікаў Беларусі ганарыцца тым, што ў маі 2014 года Указам Прэзідэнта Туркменістана перакладчыкі і паэты з Беларусі Казімір Камейша і Ганад Чарказян за асаблівыя заслугі ў вывучэнні, распаўсюджванні і папулярызацыі творчай спадчыны Махтумкулі Фрагі ўзнагароджаны медалём Туркменістана «*Magtymguly Pyragy*»: яны пераклалі зборнік вершаў паэта на беларускую мову. Прэзентацыя адбылася ў Мінску ў сярэдзіне красавіка 2014 года ў Доме літаратара.

Саюз пісьменнікаў Беларусі выказвае вялікую павагу да асобы выдатнага сына туркменскага народа, — гаворыцца ў лісце СПБ, накіраваным у Пасольства Туркменістана. Улічваючы ролю і значнасць Махтумкулі Фрагі ў сусветнай культуры, яго імя вартае ўнясення ў рэестр праграмы ЮНЕСКА «Памяць свету». Гэта наш агульны гонар і агульны здабытак.

Марыя ЛІПЕНЬ

стасункі

Свавольствы, апранутыя ў вершы

Нярэдка можна пачуць засцярогі аб тым, што цяпер, калі з'явілася альтэрнатыва папяровай кнізе ў выглядзе электроннага аналага, яна імкліва страчвае папулярнасць. Але, як заўважаюць бібліятэкары, маленькія чытачы, малодшыя і сярэднія школьнікі па-ранейшаму ахвотна наведваюць кніжніцу, бяруць удзел у імпрэзах, прэзентацыях і дзіцячых выстаўках, якія арганізоўваюць супрацоўнікі ўстановы сумесна з пісьменнікамі і мастакамі.

Дзмітрый Юртаеў падпісвае сваю кнігу для бібліятэкі.

Нягледзячы на тое, што дзеці могуць тут прысутнічаць, не выпускаючы з рук смартфона, кнігі яны бяруць усё ж з задавальненнем — цікавасць да чытання застаецца. Больш за тое, часта прыводзяць з сабою дарослых, наноў прывучаючы да чытання.

Бо літаратура для дзяцей, якая апошнія дзесяцігоддзі выходзіць з друку айчынных выдавецтваў, адпавядае найлепшаму гатунку. Каб спаборнічаць з электроннымі кнігамі, кожны ўдзельнік выдавецкага працэсу мусіць выяўляць цуды ў сваёй справе: і пісьменнік, і мастак, і дызайнер, і паліграфіст.

Прыкладам таму і кніга «Ні секунды цішыні» (Ни секунды тишины»), якая пабачыла свет у Выдавецкім доме «Звязда». Яе нядаўна прэзентаваў чытачам Цэнтральнай бібліятэкі імя Янкі Купалы аўтар Дзмітрый Юртаеў. Выданне гэтае пра самых няўрымслівых, вясёлых і гарэзлівых хлопчыкаў, дзяўчатак, а таксама чатырохногіх і крылатых іх сяброў. Малыя любяць свавольствы, часам і бяскрыўдныя шкоднасці, апранутыя ў дасціпныя вершы, перакананы аўтар. Творы на адпаведную тэматыку і склалі змест кнігі.

Дзмітрый Юртаеў вядомы чытачу найперш па сур'ёзнай лірыцы. Зборнік паэзіі пад назвай «Палі!» («ЖГИ!») пабачыў свет у 2014 годзе.

— Пачынаў з вершаў, далёкіх ад дзіцячай літаратуры. Але, выходзячы на вуліцу, бачу дзяцей, якія гуляюць, бегаюць, часам падыходзяць да цябе і спрабуюць пажартаваць. Прыглядаўся, прыслухоўваўся, нават гарэзіў разам з малымі, а потым самі сабой сталі з'яўляцца вершы для малодшай аўдыторыі. Часта жартую: дзіцячы пісьменнік проста абавязаны і сам быць дзіцём! — дзяліўся з наведвальнікамі кніжніцы Дзмітрый Юртаеў.

Па-мастацку фантазіі аўтара ўвасобіла Аксана Аракчэева, чые сюжэты маляўніча і ярка перададзены ў малюнках чароўнай краіны дзяцінства.

Таша ШПАКОЎСКАЯ
Фота Кастуся ДРОБАВА

выстаўкі

На восеньскай аўтограф-сесіі

«Кніжная восень у сталіцы» — такую лірычную назву атрымала выстаўка-кірмаш, што з 20 да 24 кастрычніка праходзіла ў гандлёвым цэнтры «Сталіца». Удзел бралі выдаўцы, паліграфісты, кнігараспаўсюджвальнікі з Беларусі і Расіі. Тут былі прадстаўлены кнігі з розных гарадоў Садружнасці: Мінска, Масквы, Санкт-Пецярбурга, Самары і г. д.

Кожны дзень на выстаўцы-кірмашы ладзіліся аўтограф-сесіі беларускіх пісьменнікаў. Актыўны ўдзел у іх прынялі члены Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхась Пазнякоў, Яўген Крыжаноўскі, Уладзімір Мазго, Кацярына Стройлава, Іна Фралова, Ірына Тулупава, Лізавета Палеес, Таццяна Жылінская, Людміла Воранава, Валерый Максімовіч, Андрэй Душачкін, Алена Басікірская і іншыя. Наведвальнікі экспазіцыі мелі цудоўную магчымасць набыць кнігі з аўтографамі і задаць пытанні аўтарам.

Уладзімір ПРАХАРЭНКАЎ

прэзентацыі

З далёкіх часоў і да сёння

Лідскую раённую бібліятэку імя Янкі Купалы наведалі літаратары — члены літаб'яднання «Суквецце» пры рэдакцыі «Лідскай газеты». Нагодай стала прэзентацыя кнігі Ірэны Сліўко «Выток пачынаўся ад Гаўі».

Ірэна Нікадзімаўна нарадзілася ў вёсцы Залейкі Іўеўскага раёна Гродзенскай вобласці, на мяжы двух раёнаў — Іўеўскага і Лідскага, якія раздзяляе рака Гаўя. Творы, змешчаныя ў кнізе «Выток пачынаўся ад Гаўі», напоўнены найперш светлымі пачуццямі да малой радзімы. Да таго ж аўтар адкрывае перад чытачом таямніцы сваёй душы пра шчырую любоў да родных і жыхароў вёскі, захапляецца прыгажосцю прыроды.

Аддзел абслугоўвання і інфармацыі раённай бібліятэкі прысвяціў новы выпуск анлайн-праекта «Літаратурнае сузор'е Лідчыны» жыццю і творчасці пісьменніцы і падрабязна спыніўся на яе кнізе «Выток пачынаўся ад Гаўі». Адзін з экзэмпляраў Ірэна Сліўко падаравала Лідскай раённай бібліятэцы імя Янкі Купалы.

Дар'я МАРЦІНКЕВІЧ

вернісаж

Адкуль нашы карані?

У выставачнай зале Гродзенскага абласнога метадычнага цэнтра народнай творчасці адкрылася экспазіцыя дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Карані творчасці». Звыш 140 работ ткацтва, вышыўкі, керамікі, выцінанкі, саломапляцення, мастацкага роспісу, лясной скульптуры, жывапісу 15 сучасных майстроў народнай творчасці Ваўкавыскага раёна ўпрыгожылі экспазіцыю.

Фрагмент экспазіцыі.

Асаблівая ўвага — тканым вырабам народнага майстра Любові Балёнь з вёскі Студзянец Ваўкавыскага раёна. Дзякуючы ёй і яе пераемніцы Яніне Іюльскай у гэтых мясцінах збераглі і практыкуюць да нашага часу простае двухнітовае ткацтва і вучаць рамяству дзяцей і ўсіх ахвотных у філіяле «Роскі цэнтр рамёстваў» дзяржаўнай установы «Ваўкавыскі раённы Цэнтр рамёстваў». Таму экспазіцыя пачынаецца з 12-метровага стракатага ходніка, вытканага ў дзіцячым гуртку дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва «Куфэрак» Роскага цэнтра рамёстваў старадаўняй тэхнікай ткацтва.

На адкрыцці праекта Святлана Кудаш, загадчыца філіяла «Роскі цэнтр рамёстваў», распавяла пра творчасць выбітных майстроў Ваўкавышчыны: вышывальшчыц Ірыны Пекар, Аксаны Талькоўскай, Надзеі Развадоўскай, керамістаў Аляксея Рамаусава і Марыны Гайдзель, майстра мастацкага роспісу Жанны Сямак, майстра выцінанкі Марыны Дубовік, майстроў саломапляцення Аксаны Урублеўскай і Святланы Прахінай.

З выступленняў знакамітага майстра саломапляцення кіраўніка ўзорнага тэатра моды «Спадчына» Ваўкавыскага цэнтра творчасці дзяцей і моладзі Алы Сурмінавай, мастака Анатоля Сямёнава і майстра лясной скульптуры Анатоля Зубанава стала зразумела, што Ваўкавышчына — край таленавітых людзей, якім ёсць чым ганарыцца.

Яніна БАРЫСЕВІЧ, фота аўтара

імпрэзы

Яе душы святлінкі...

Сустрэчу, прымеркаваную да 70-годдзя пісьменніцы Надзеі Парчук, падрыхтавалі ў анлайн-рэжыме супрацоўнікі Брэсцкай абласной бібліятэкі імя А. С. Пушкіна. Вядучай стала Тамара Юрчык, якой Надзея Мікалаеўна расказала пра асноўныя вехі сваёй творчасці, літаратурныя перамогі, перакладчыцкую, літаратуразнаўчую дзейнасць, супрацоўніцтва з кампазітарамі.

Надзея Парчук прызналася, што крыніцай натхнення, мудрасці, любові і цеплыні сталі родная вёсачка Ладараж, бацькоўская навука ды шчырае стаўленне да людзей. «На дабро адказвай дабром, а на зло — падзякай, каб выкарчаваць дрэннае з жыцця», — вось такое крэда пісьменніцы. У сваіх творах Надзея Мікалаеўна заклікае напаўняць жыццё добрымі справамі, не адступаць перад цяжкасцямі і штодзень адкрываць для сябе непаўторны навакольны свет.

На свята да пісьменніцы прыйшлі адзінаццацікласнікі Брэсцкага абласнога ліцэя імя П. М. Машэрава. Кожны з іх падрыхтаваў выразнае чытанне вершаў з паэтычных зборнікаў аўтара.

Паэтэса — удзельніца многіх літаратурна-выдавецкіх праектаў, складальнік і рэдактар бібліяграфічнага даведніка Брэсцкага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі «Творчы партрэт пісьменніцкай суполкі», кнігі духоўнай паэзіі «Дазволь прычасціцца». Актыўна дапамагае і пачынаючым паэтам, і калегам па пяры.

— З маёй падтрымкай за гэты час было выдадзена каля 20 кніг, — распавяла аўтарка. — Быць рэцэнзентам, рэдактарам — адказная праца, бо кожны радок прапускаеш праз сваё сэрца.

Пра душэўную дабрыню і чуласць Надзеі Мікалаеўны, яе ўменне глыбока і ўсебакова раскрыць хвалюючыя тэмы ў паэзіі, далучыць моладзь да духоўнасці гаварылі кобрынская паэтка Зінаіда Навасад і супрацоўніца Ласіцкай бібліятэкі Наталля Чынько. Словы падзякі за самабытную паэзію выказалі супрацоўнікі Іванаўскай і Камянецкай бібліятэк.

Падчас сустрэчы Надзеі Парчук уручылі грамату Саюза пісьменнікаў Беларусі «За значны творчы ўклад у беларускую літаратуру і актыўны ўдзел у грамадска-культурным жыцці краіны і ў сувязі з 70-годдзем», а таксама бібліяграфічны ўказальнік літаратуры «Святлінкі яе душы», створаны супрацоўнікамі бібліятэкі імя А. С. Пушкіна да юбілею паэткі.

Таццяна ДЗЕМІДОВІЧ

фестывалі

На экранах Магілёва

Гэтымі днямі завяршыўся чарговы міжнародны фестываль анімацыйных фільмаў «Анімаёўка» ў Магілёве. Да ўдзелу было прынята ажно 180 мультфільмаў (у тым ліку дзіцячая анімацыйная творчасць). Конкурсную ж праграму склалі 112 праектаў з 19 краін свету. Беларусь гэтым разам прадстаўляла больш як 30 карцін.

Міжнародны фэст з працяглай гісторыяй прайшоў ужо дваццаць чацвёрты раз. Гісторыя «Анімаёўкі» пачалася ў далёкім 1998 годзе, калі па прапанове слыннага беларускага мультыплікатара Ігара Воўчака быў зладжаны першы кінаагляд у Мінску. Крыху пазней пры актыўным садзейнічанні тагачаснага генеральнага дырэктара «Магілёўаблкінавідэапракату» Андрэя Бычкова фестываль быў перанесены: з той пары штогод увосень Магілёў прымае гасцей з усяго свету.

Ад Беларусі сёлета была заяўлена 31 стужка, у тым ліку тры — вытворчасці Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм». Конкурс уласна анімацыйных фільмаў склалі 63 работы, тады як на традыцыйную праграму дзіцячай мультыплікацыі прыйшлося 49. З цікавага: спіс краін-удзельніц прыйшлося 49. З цікавага: спіс краін-удзельніц у 2021 годзе папоўніўся прадстаўнікамі Паўночнай Македоніі і Егіпта.

Акрамя саміх кінапаказаў, у рамках фэсту праходзяць і іншыя мерапрыемствы. На конкурсе дзіцячай выяўленчай і дэкаратыўна-прыкладной творчасці гэтым разам былі прадстаўлены 128 малюнкаў і 51 дробны выраб. Да таго ж прайшлі тры майстаркласы: вопытам з дзецьмі дзяліліся Эдуард Ханок, Алена Турава і выкладчыца Магілёўскай дзіцячай школы выяўленчых мастацтваў Ларыса Будкевіч.

Мікіта ШЧАРБАКОЎ

з нагоды

Пад зоркай матуль

У кастрычніку бярэзінскія бібліятэкі ў анлайн-прасторы і на кніжных выстаўках пашырана рэкламавалі мастацкія творы, якія ўвасабляюць вобраз жанчыны-маці. Убачыць і пачуць такія творы, раскласці па палічках эмоцыі дазволіў бібліятэчны монатэатр «Апавяданне на біс», які на працягу месяца прадстаўляў літаратурную панараму прысвячэнняў маці кароткімі апавяданнямі сучасных беларускіх празаікаў.

Паўгадзіны арыгінальнай міні-прозы — і апавяданні «залатой кніжнай пяцёркі» загучалі! Знешняе пераўвасабленне бібліятэчнага акцёра-чытальніка з дапамогай простых дэкарацый і прадметаў дазволіла вобразна раскрыць творы, падключыць гледачоў да сумеснага роздуму. Апавяданне Міхаіла Герчыка «Кубак малака» стала гімнам жанчыне, якая свой мацярынскі абавязак паставіла вышэй за «бабіна шчасце» з чужым для яе дзетак мужчынам, не вартым стаць для іх добрым бацькам. Гераіня апавядання Святланы Кражавай «Маці» ў складаныя пасляваенныя гады выкарміла нованароджанага ўнука (!), якога пакінула дачка-актрыса, з'ехаўшы на гастролі. Сюжэт апавядання Міхася Куляша «Дачушка» выклікаў перажыванні за пакінутае ў лесе шалахвосткай-матуляй немаўлятка і дазволіў адчуць радасць прыёмнай матулі, якой дзяўчынка падорыць сваё першае слова. Галоўнае багацце жанчыны — не ўборы, а дзеці. Такую ідэю заклала ў аповедзе-эсэ «Матуліны туфлікі» Тамара Бунта. Рэчы пішуць асабістую гісторыю асобнага чалавека, жывуць даўжэй, чым людзі, і множаць добрыя пачуцці да самага блізкага чалавека. Як тэрміновыя тэлеграмы ўспрымаліся слухачамі высновы-заклікі апавяданняў Валянціны Кадзетавай «Пуховая хустка» і Барыса Сачанкі «Пісьмо да матулі»: не адкладвайце візіт ці тэлефонны званок да матулі, не шкадуйце добрых слоў, каб не спазніцца і потым не шкадаваць усё жыццё. Салодкая спакуса — горкі ўрок героя Міхася Пазнякова «Цукеркі»: купленыя ў дзяцінстве ласункі на выдзеленыя матуляй грошы на падручнікі — і самотныя слёзы матулі, якія вырэдзяць душу сына і ў сталым узросце. Прадстаўленыя бібліятэчным міні-тэатрам сюжэты твораў Віктара Строкіна «Рэквіем па 25-м» і Анатоля Бутэвіча «Стасева ялінка» пра мацярынскія пакуты ад страты адзіных сыноў у лакальных войнах прагучалі папярэджваннем у наш няпросты час. Апавяданні беларускіх празаікаў гучалі на біс у маладзёжнай і ў дарослых аўдыторыях.

Бібліятэкары і кнігалюбы Бярэзіншчыны удзячныя калектыву газеты «Літаратура і мастацтва» за рубрыку «Проза», якая далучае нас да важкай кніжнай скарбонкі літаратурных дэбютаў і служыць базай нашых бібліятэчных праектаў «Жывая кніга», «Чытай-дворык», «Чароўнае святло кнігі».

Тамара КРУТАЛЕВІЧ

«ЛіМ»-люстэрка

Пастаноўка Рэспубліканскага тэатра беларускай драматургіі «Шлюб з ветрам» атрымала прыз прэсы імя Леаніда Папова як спектакль вялікай формы на XXXI Міжнародным тэатральным фестывалі «Балтыйскі дом» у Санкт-Пецярбургу, перадае агенцтва «Мінск-Навіны». У праграме фэсту прынялі ўдзел 18 спектакляў з Беларусі, Расіі, Італіі і Літвы. Узнагароджанне прайшло ў анлайн-фармаце. Пастаноўка «Шлюб з ветрам» — гісторыя аднаго беларускага вяселля ў нацыянальных традыцыях, на фоне якога разыгрываецца глыбокая псіхалагічная драма. У творы фактычна адсутнічаюць дыялогі, таму асноўным выяўленчым сродкам выступаюць музыка і песні.

Міжнародная выстаўка сучаснага мастацтва тэкстылю і мікс-медыя *Here, There and Everywhere* («Тут, там і паўсюль») адкрылася ў Гарадской мастацкай галерэі твораў Леаніда Шчамялёва. Экспазіцыя транслюе новы погляд на старадаўнія традыцыі мастацтва тэкстылю, яго пераасэнсаванне ў іншых напрамках мастацтва і змешаных тэхніках, інфармуе БелТА. Прадстаўлена больш за 100 работ. Іх аўтары — мастак Судзэ Дадрас (Іран, ЗША), Мануэль Вандл (Аўстрыя), Стэфан *Secretspaces* (Германія), Рахул Шарма (Індыя, Нідэрланды) і Хрысціна Высоцкая (Беларусь). Між тым гледачы змогуць наведаць сустрэчы з удзельнікамі праекта і экскурсіі. Аўтар і куратар выстаўкі — Хрысціна Высоцкая. Праект будзе працаваць да 28 лістапада.

Прэм'ерны паказ поўнаметражнага анімацыйнага фільма Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» «Зоркі сёмага неба» прайшоў у Маскве. «Мультфільм прадставіла рэжысёр Алена Турава. Гледачы высока ацанілі навінку беларускай анімацыі, дарослыя і дзеці выказалі ўдзячнасць рэжысёру за добрую музычную казку і неверагодныя эмоцыі пасля прагляду», — цытуе БелТА словы прэс-сакратара кінастудыі Алёны Астаповіч. На прэм'еры прысутнічалі вядомы савецкі і расійскі рэжысёр і мастак-мультыплікатар Леанід Носыраў, гукарэжысёры Віктар Морс і Барыс Венгероўскі. Над анімацыйным фільмам працавалі пяць гадоў, у яго аснове — аднайменная кніга Генадзя Давыдзькі. Спецыяльна для гэтага праекта кампазітар Леанід Шырын напісаў больш за 40 песень. Галоўныя ролі агучылі беларускія артысты.

Названы лаўрэаты літаратурнай прэміі «Ясная паляна». Як паведамляецца на сайце конкурсу, у намінацыі «Сучасная руская проза» перамог Герман Садулаеў з кнігай «Гоцкія пісьмы». У намінацыі «Замежная літаратура» найлепшым стаў раман «Няма чаго баяцца» Джуліяна Барнса. Дзмітрый Сіманоўскі і Сяргей Палатоўскі атрымалі прэмію за пераклад згаданага твора (намінацыя «Замежная літаратура»). Кніга пісем «Кожны дзень спачатку. Валянцін Распуцін і Валянцін Курбатаў: дыялог даўжынёю ў сорак гадоў» з пасляслоўем Дзмітрыя Шаварава названа найлепшай у катэгорыі «Падзея». Уладальнікам спецыяльнага прыза «Выбар чытачоў» стала Марына Сцяпнова з творам «Сад», якая набрала 41 % галасоў у інтэрнэт-галасаванні на сайце прэміі.

Элтан Джон выпусціў запісаны падчас лакдаўну альбом «*The Lockdown Sessions*». На вокладцы спявак у масцы. Як піша РІА «Новости», у альбом увайшлі 16 песень: у асноўным гэта дуэты і каверы. У запісе пласцінкі прынялі ўдзел 20 артыстаў. Сярод іх — Стыві Уандэр, Стыві Нікс, Дуа Ліпа, *Gorillaz* і многія іншыя. Напрыклад, сваю версію «*Nothing else matters*», хіта гурта *Metallica,* Элтан Джон запісаў з Майлі Сайрус. Музыкант таксама падзяліўся гісторыямі стварэння кожнай кампазіцыі. Успаміны і ўражанні апублікаваны на яго сайце.

Дом-музей пісьменніка-рэаліста, публіцыста і палітычнага дзеяча Эміля Заля пасля працяглага перапынку аднавіў сваю работу ў горадзе Медан, за 30 кіламетраў на паўночны захад ад Парыжа. Як інфармуе «ИТАР-ТАСС», на рэстаўрацыю вялікага асабняка спатрэбілася 10 гадоў. Пісьменнік пражыў тут 24 гады — з 1878 да 1902-га. За гэты час былі створаны такія знакамітыя творы, як «Жэрміналь», «Нана», «Дамскае шчасце» і «Чалавек-звер». Цяпер у дзвюх прыбудовах сядзібы адкрыты першы ў Францыі музей, прысвечаны справе Альфрэда Дрэйфуса, на плошчах размясціліся шматлікія дакументы і публікацыі той эпохі, лістоўкі, афішы, рэдкія фотаздымкі.

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

З разуменнем высокай адказнасці

Нядаўна адбыўся справаздачна-выбарчы сход Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі. Старшынёю МГА СПБ зноў аднагалосна абраны Міхаіл Паўлавіч Пазнякоў.

Ад рэдакцыі

Падчас Дня пісьменства.

За пасляз'ездаўскі час пісьменнікамі сталічнага аддзялення выдадзена амаль 600 кніг — паэзіі, прозы, публіцыстыкі, дзіцячай літаратуры, перакладаў. На вершы паэтаў-песеннікаў напісана звыш 200 песень.

Важкія творчыя набыткі на рахунку паэтаў Анатоля Аўруціна, Таццяны Атрошанкі, Міхася Башлакова, Навума Гальпяровіча, Віктара Гардзея, Сяргея Давідовіча, Казіміра Камейшы, Уладзіміра Мазго, Міколы Маляўкі, Ганны Мартынчык, Змітрака Марозава, Міколы Мятліцкага, Лізаветы Палеес, Валянціны Паліканінай, Наталлі Саветнай, Вольгі Сакаловай, Андрэя Скарынкіна, Ірыны Тулупавай, Іны Фраловай, Міколы Чарняўскага, Міколы Шабовіча, Віктара Шніпа, Вольгі Шпакевіч.

Сказалі сваё слова празаікі Наталля Батракова, Уладзімір Гніламёдаў, Анатоль Драздоў, Сяргей Зайцаў, Мікалай Ільінскі, Казімір Камейша, Віталь Кірпічэнка, Анатоль Казлоў, Наталія Касцючэнка, Фёдар Конеў, Ягор Конеў, Маргарыта Латышкевіч, Алесь Марціновіч, Георгій Марчук, Анатоль Мацвіенка, Валянцін Маслюкоў, Уладзімір Навумовіч, Віктар Праўдзін, Анатоль Разановіч, Наталля Саветная, Уладзімір Саламаха, Сяргей Трахімёнак, Уладзімір Тулінаў, Яўген Хвалей, Мікалай Чаргінец, Ганад Чарказян, Мікола Чарняўскі, Віктар Шніп.

Хочацца адзначыць і дасягненні публіцыстаў Валерыя Алешкі, Якава Алексейчыка, Міколы Багадзяжа, Ірыны Масляніцынай, Віктара Ермаловіча, Аляксандра Плавінскага, Уладзіміра Макарава, Алеся Марціновіча, Вольгі Паўлючэнкі, Уладзіміра Тулінава, Валерыя Чудава, Міхаіла Шыманскага, Віктара Шымоліна, Гардзея Шчаглова…

Важкі ўнёсак і ў галіне дзіцячай літаратуры. Гэта працы аўтараў Алеся Бадака, Тамары Бунты, Ніны Галіноўскай, Таццяны Дамаронак, Валерыя Квілорыі, Уладзіміра Кулічэнкі, Уладзіміра Ліпскага, Уладзіміра Мазго, Міколы Маляўкі, Алеся Марціновіча, Вольгі Нікольскай, Таццяны Сівец, Ірыны Токаравай, Іны Фраловай, Міколы Чарняўскага, Івана Юркіна, Яны Явіч…

Адказваюць на выклік часу і літаратуразнаўцы і крытыкі: Людміла Вараб'ёва, Яўген Гарадніцкі, Ніна Каленчыкава, Валерый Максімовіч, Алесь Марціновіч, Іван Саверчанка, Уладзімір Гніламёдаў, Таццяна Мацюхіна, Мікалай Мікуліч, Мікола Чарняўскі, Таццяна Шамякіна…

Лаўрэатамі Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі сталі Анатоль Аўруцін, Казімір Камейша, Мікола Маляўка, Віктар Шніп (паэзія); Георгій Марчук, Алег Ждан, Віктар Праўдзін (проза); Міхась Пазнякоў, Вольга Нікольская, Валянціна Паліканіна (дзіцячая літаратура); Васіль Шырко (публіцыстыка); Іван Саверчанка (літаратуразнаўства); Маргарыта Латышкевіч, Юлія Алейчанка, Станіслава Умец, Вольга Нікіценка, Кацярына Стройлава (найлепшы дэбют). Многія пісьменнікі ўганараваныя прэстыжнымі міжнароднымі літаратурнымі прэміямі (Анатоль Аўруцін, Вячаслаў Бандарэнка, Таццяна Жылінская, Наталія Касцючэнка, Міхась Пазнякоў, Наталля Саветная, Сяргей Трахімёнак, Яна Явіч і інш.).

У кніжных серыях МГА СПБ выйшла 39 кніг. З іх больш за палову — першыя кнігі юных літаратараў.

Сталічнае аддзяленне СПБ заснавала і свае літаратурныя прэміі. У галіне паэзіі — імя Максіма Танка, прозы — імя Івана Шамякіна, публіцыстыкі — імя Івана Новікава, дзіцячай літаратуры — імя Янкі Маўра, «Адкрыццё года» — за найлепшы дэбют.

Так, напрыклад, у мінулым годзе лаўрэатамі літаратурных прэмій сталічнага аддзялення сталі: Мікола Шабовіч — за кнігу вершаў «Я і Ты»; Алена Папова — за кнігу прозы «Песня блістающей химеры»; Анатоль Зэкаў — за кнігу твораў для дзяцей «Варыла вячэру варона»; Віктар Ермаловіч — за кнігу публіцыстыкі «Беларусь. Шлях да Вялікай Перамогі».

Творы многіх нашых пісьменнікаў друкуюцца ў замежных краінах у перакладзе на 29 моў. І не толькі ў перыядычных выданнях, але і выходзяць асобнымі кнігамі. Напрыклад, у Расіі выйшлі кнігі Мікалая Чаргінца, Анатоля Аўруціна, Міхася Пазнякова, Сяргея Трахімёнка, Наталлі Саветнай, Анатоля Драздова…

Ва Украіне — Міхася Пазнякова і Таццяны Жылінскай; у Германіі — Анатоля Аўруціна; у Турцыі — Мікалая Чаргінца; у Сірыі — Міхася Пазнякова; у Вялікабрытаніі — Анастасіі Кузьмічовай…

Актыўна працуюць і нашы пісьменнікі-перакладчыкі. У першую чаргу гэта Анатоль Аўруцін, Іван Чарота, Мікола Шабовіч, Алесь Марціновіч, Таццяна Сівец, Алена Басікірская, Міхаіл Кулеш, Андрэй Цяўлоўскі, Аляксей Чарота, Алена Чыжэўская, Зінаіда Краснеўская, Адам Шостак і інш. У перакладзе Міколы Мятліцкага на беларускай мове выйшла кніга вершаў класіка казахскай літаратуры Абая Кунанбаева і кніга вершаў кітайскіх паэтаў. У перакладзе Міхася Пазнякова — кнігі вершаў Магамеда Ахмедава (Дагестан), Адама Ахматукаева (Чачня), Эрдні Эльдышава (Калмыкія), Юрыя Шчарбакова (Астрахань), а таксама чатырохтомны раман-эпапея класіка казахскай літаратуры Мухтара Аўэзава «Шлях Абая».

Шчыравалі нашы гумарысты і сатырыкі Юлія Зарэцкая, Анатоль Зэкаў, Яўген Крыжаноўскі. Не адставалі драматургі Георгій Марчук, Сяргей Гіргель, Святлана Бартохава, Таццяна Сівец, Ала Саскавец, Алена Папова і інш.

У песенным жанры плённа працавалі Іван Юркін, Тамара Залеская, Таццяна Жылінская, Алег Жукаў, Фёдар Баравой, Мікола Шабовіч, Людміла Воранава, Іван Цітавец і інш.

Пісьменнікамі аддзялення праведзена і вялікая культурна-асветніцкая работа. Працягвалася творчае супрацоўніцтва з установамі адукацыі і культуры горада. Плённа працавалі 38 творчых клубаў, студый, аб'яднанняў у розных мікрараёнах. Асабліва — студыя юных літаратараў «Малінаўскія галасы» пры дзіцячай бібліятэцы № 15, паэтычны клуб «Парнас» — пры публічнай бібліятэцы № 5, творчы клуб «Шчырасць» — пры публічнай бібліятэцы № 22, «Кабінет пісьменніка» — пры дзіцячай бібліятэцы № 2, творчы клуб «Спадчына» — пры гімназіі № 35, клуб «Творчыя сустрэчы» — пры публічнай бібліятэцы № 8, клуб «Паэтычны аўторак» — пры публічнай бібліятэцы № 7, клуб «Аўтограф» — пры інтэрнаце БДЭУ і інш.

Самыя плённыя, разнапланавыя стасункі ў нас з гарадскімі бібліятэкамі. Як з дзіцячымі (іх 18), так і з публічнымі (іх 25), а таксама з абласной кніжніцай, з бібліятэкай Цэнтральнага Дома афіцэраў, з Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі. Творчыя вечары, прэзентацыі, выстаўкі, круглыя сталы, канферэнцыі, творчыя конкурсы, юбілейныя святы — такія асноўныя кірункі нашага супрацоўніцтва.

Шосты сезон распачаў наш Тэатр паэзіі, які працуе пры Цэнтральнай гарадской бібліятэцы імя Янкі Купалы (мастацкі кіраўнік — артыстка эстрады і тэатра Вольга Багушыньска). Дарэчы, за гэты час тэатр паказаў свае спектаклі на розных пляцоўках у сталіцы, на Славянскім базары ў Віцебску, на Днях беларускага пісьменства ў Бялынічах, Капылі, у іншых гарадах краіны. З намі супрацоўнічаюць як прафесійныя артысты, спевакі, кампазітары, так і самадзейныя. Мы ўдзячныя за супрацоўніцтва з нашым тэатрам заслужаным артыстам Рэспублікі Беларусь Ірыне Нарбекавай, Андрэю Душачкіну, Алегу Сямёнаву, Эдуарду Гарачаму, Яўгену Крыжаноўскаму і такім вядомым у краіне творчым асобам, як Вячаслаў Статкевіч, Сяргей Кравец, Аляксандр Валодчанка. З вялікім поспехам прайшлі спектаклі, прысвечаныя творчасці Янкі Купалы, Максіма Багдановіча, Сяргея Ясеніна, Аляксандра Пушкіна, Яўгеніі Янішчыц, а таксама нашых сучаснікаў: Анатоля Аўруціна, Уладзіміра Мазго, Таццяны Атрошанкі, Таццяны Жылінскай, Валерыя Максімовіча, Лізаветы Палеес, Міколы Шабовіча, Аліны Легастаевай, Фёдара Баравога, Яўгена Хвалея, Ганны Мартынчык, Іны Фраловай, Вольгі Норынай, творчай моладзі, а таксама нашых замежных сяброў — Магамеда Ахмедава, Юрыя Шчарбакова (Расія), Таццяны Дзюба, Сяргея Дзюбы (Украіна).

Купалаўскае свята. Вязынка.

Плённае супрацоўніцтва наладжана з Міністэрствам абароны, Дзяржпагранкамітэтам Рэспублікі Беларусь, Упраўленнем культуры і Галоўным упраўленнем ідэалагічнай работы і па справах моладзі Мінгарвыканкама.

Праводзіцца работа з юнымі літаратарамі і аматарамі высокага мастацкага слова. Традыцыйнымі сталі нашы творчыя конкурсы на найлепшы твор сярод вучняў і студэнтаў, а таксама конкурс чытальнікаў паэзіі і прозы. Самых лепшых мы залічваем у пазаштатныя артысты Тэатра паэзіі. Юных і маладых літаратараў далучаем да ўдзелу ў розных творчых мерапрыемствах. Ладзім фестываль маладой паэзіі, праводзім кансультацыі, вучобу ў «Школе юнага паэта» і «Школе юнага празаіка». Актыўна з маладымі творцамі працуюць нашы калегі Анатоль Аўруцін, Уладзімір Мазго, Наталія Касцючэнка, Анатоль Зэкаў, Віктар Шніп, Іна Фралова, Вольга Паўлючэнка, Валянціна Драбышэўская, Кацярына Роўда, Юрась Нераток і інш.

Па меры магчымасці супрацоўнічаем з пісьменніцкімі арганізацыямі Масквы, Санкт-Пецярбурга, Калінінграда, Астрахані, Цюмені, Дагестана, Калмыкіі, Чачні, Чарнігава, Кіева. З'яўляемся сузаснавальнікамі двух міжнародных літаратурных конкурсаў: з Санкт-Пецярбургскім аддзяленнем СП Расіі і ўкраінскім выдавецтвам «Пісьменнік у інтэрпрасторы» (г. Кіеў). Удзельнічаем у мерапрыемствах пасольстваў Расіі, Казахстана, Арменіі, Кітая, Ірана, Палесціны…

За плённую творчую і грамадскую дзейнасць 24 нашы пісьменнікі атрымалі высокія дзяржаўныя ўзнагароды. Так, напрыклад, заслужанымі дзеячамі культуры Рэспублікі Беларусь сталі Мікалай Чаргінец, Генадзь Пашкоў, Мікола Мятліцкі, Уладзімір Ліпскі, Навум Гальпяровіч, Мікола Чарняўскі, Алесь Марціновіч, Уладзімір Карызна, Уладзімір Гніламёдаў. Ордэнам Францыска Скарыны ўзнагароджаны Анатоль Аўруцін. 14 пісьменнікаў уганараваны медалём Францыска Скарыны. Асабліва цяпер мы разумеем, як важна ў наш няпросты час быць разам са сваім народам, яго ўладай, працаваць на адзінства. Сваім высокім і сумленным словам адстойваць згоду ў грамадстве, закон і парадак, якія з'яўляюцца гарантам далейшага росквіту краіны — дэмакратычнай, незалежнай, заможнай. Таму ў сваіх творах, у шматлікіх выступленнях перад чытачамі імкнёмся годна і шчыра адказваць на выклікі часу, заставацца вернымі высокім бацькоўскім запаветам у служэнні дабру, праўдзе, міру, стваральнасці.

Міхась ПАЗНЯКОЎ
Фота з архіва аўтара

Скрозь час і прастору — да гледача

Напярэдадні святочных мерапрыемстваў мы сустрэліся з Сяргеем Кулікоўскім, у мінулым галоўным рэжысёрам Новага драматычнага тэатра, а сёння яго мастацкім кіраўніком. Сустрэліся, каб у нефармальных абставінах пагутарыць пра галоўныя дасягненні культурнай установы за трыццаць гадоў яе існавання, а таксама пра планы калектыву на будучыню. Акрамя таго, Сяргей Міхайлавіч падзяліўся цікавай інфармацыяй з-за куліс і крыху расказаў пра ўласную творчасць.

Сцэна са спектакля «Калі б ведаць», 2016 г.

Перш за ўсё, каб пазбегнуць блытаніны, трэба канчаткова вызначыцца з тым, адкуль, так бы мовіць, у свята ногі растуць. Сама круглая дата прыпадае на вясну наступнага года, але трыццаты рэпертуарны сезон, натуральна, пачаўся ўжо цяпер, восенню. Такім чынам, юбілей расцягнецца ажно на два гады, і яны абяцаюць быць асаблівымі: гледачоў чакае шмат цікавых пастановак і падзей. Некаторыя ж прэм'еры ўжо адбыліся: скажам, у верасні наведвальнікам прэзентавалі спектакль «Хамсін», генеральныя паказы якога прайшлі яшчэ ўлетку, а на мінулым тыдні дэманстраваліся «Вадэвілі» (паводле Чэхава).

1992 год у якасці пункта адліку быў абраны невыпадкова. Тады, як ужо згадвалася, тэатр атрымаў статус гарадскога. Тытул гэты, акрамя таго, што накладвае на трупу пэўныя абавязкі, яшчэ і многае дае. Напрыклад, тая ж пасезонная праца… Ды і ўвогуле — прызнанне, афіцыйнасць, у рэшце рэшт, стацыянарнасць. Уласна, таму ў тэатры і павялося адлічваць узрост ад прыведзенага моманту. Самой жа ініцыятыве спаўняецца сёлета 35 гадоў (таксама, між іншым, дата круглая). Трэба сказаць, што абедзвюм падзеям у калектыве надаецца аднолькава вялікае значэнне, і гэта зусім нездарма…

Некаторыя члены каманды працуюць тут яшчэ з часоў тэатра-студыі або, прынамсі, з дзевяностых. Асабліваў павагай сярод супрацоўнікаў карыстаецца, напрыклад, актрыса Людміла Баталава, яна далучылася да студыі «Дзе-Я?» яшчэ ў 1987 годзе, на самым пачатку яе існавання! Акрамя таго, сапраўднымі «старажыламі» тэатра можна назваць акцёраў Ігара Мікалаева, Валерыя Агаяна, актрыс Наталлю Капітонаву, Ірыну Карніевіч… Пералічаныя творцы прыйшлі ў тэатр яшчэ ў тыя часы, калі яго мастацкім кіраўніком быў Мікола Трухан.

Аднак гэта далёка не ўсе ветэраны Новага драматычнага. З даўніх часоў працуюць і некаторыя з прадстаўнікоў тэхнічных службаў: напрыклад, загадчыца рэквізітарскага цэха, галоўны касцюмер, галоўны бухгалтар… Ды што казаць, дырэктар установы Васіль Марцецкі таксама з'явіўся тут больш за дваццаць гадоў назад — у 1998-м. Пасля хуткай і раптоўнай смерці легендарнага рэжысёра Міколы Трухана, які кіраваў фактычна і ўсімі гаспадарчымі справамі, Васіль Васільевіч узяў, як кажуць, лейцы ў рукі, узышоўшы на пасаду дырэктара.

На гэтым моманце ненадоўга прыпынімся, каб расказаць гісторыю ўстановы падрабязней. Адразу пасля перараджэння ў новым муніцыпальным статусе тэатр дзейнічаў пад кіраўніцтвам Міколы Трухана, яго ідэйнага натхняльніка і заснавальніка. У перыяд з 1992 да 1999 года рэпертуар установы працягваў «гнуць» тую ж лінію, што і ў канцы 1980-х — зварот да нацыянальнай спадчыны і адраджэнне традыцыйных тэатральных форм, спалучаныя з наватарскім падыходам у пастаноўцы.

Сцэна, абсталяваная ў адной з залаў кінатэатра «Радзіма», бачыла і спектаклі паводле п'ес Францішка Аляхновіча («Цені», «Страхі жыцця», «Круці не круці — трэба памярці», «Чорт і баба»), якія сам рэжысёр цаніў вельмі высока, і пастаноўкі па творах Андрэя Макаёнка, Аляксея Дударава, Уладзіміра Караткевіча і іншыя. Мікола Трухан заўсёды настойваў на тым, што беларускі тэатр (у прыватнасці тэатр драмы «Дзе-Я?») павінен быць нацыянальным, таму большасць спектакляў з рэпертуару ішло на беларускай мове.

Для замежных гасцей асобныя відовішчы дубліраваліся па-англійску. Дарэчы, у той час трупа актыўна і досыць паспяхова гастраліравала не толькі па краіне, але і за яе межамі. Так, у сярэдзіне дзесяцігоддзя калектыў тры разы запар запрашалі на Эдынбургскі тэатральны фестываль, і заўсёды гэта быў фурор. І крытыкі, і радавыя брытанскія гледачы добра адгукаліся аб дзіўных пастаноўках беларусаў. Залы, калі верыць вытрымкам з тагачасных газет, былі запоўнены цалкам. Словам, «Дзе-Я?» была з'явай міжнароднага маштабу.

Штурхаў жа гэты цягнік на працягу ўсіх гадоў Мікола Трухан, прычым практычна аднаасобна. Само сабой, дзеля агульнай справы свае псіхафізічныя рэсурсы выдаткоўвалі ўсе ўдзельнікі працэсу, але ж Мікалай Мікалаевіч адназначна быў галоўным завадатарам, на яго плячах трымалася многае. Таму ўстанова вельмі цяжка перанесла раптоўны сыход рэжысёра. У пэўны момант над тэатрам нават навісла рэальная пагроза знікнення, але ж, дзякуючы вынаходлівасці новых людзей, перагрупаваўшыся, «Дзе-Я?» аднавілася ў новым фармаце.

Праз некалькі гадоў, у 2004-м, назва змянілася, а кінатэатральны будынак «Радзімы» быў канчаткова перададзены пад патрэбы прыхільнікаў Мельпамены.

Сцэна са спектакля «Варшаўская мелодыя», 2021 г.

З таго часу па адрасе вуліца Лізы Чайкінай, 16, што адносіцца да Заводскага раёна Мінска, размяшчаецца Новы драматычны тэатр. Гэткія змены былі выкліканы агульным перафарматаваннем і абнаўленнем касцяка супрацоўнікаў. Разам з тым пачалася вельмі марудная рэканструкцыя. Яна цягнулася амаль што поўныя пяць гадоў, падчас якіх трупа вандравала з месца на месца, не маючы пастаяннага прытулку. Толькі ў 2009 годзе артысты змаглі вярнуцца ў родныя сцены.

Прыкладна ў той жа момант у афішы ўпершыню мільганула імя рэжысёра Сяргея Кулікоўскага. Колішні акцёр ТЮГа, а з нядаўняй пары паспяховы пастаноўшчык з імем і гастролямі па ўсім свеце, Сяргей Міхайлавіч распачаў асабліва плённае супрацоўніцтва з Новым драматычным. Спачатку яно абмяжоўвалася асобнымі спектаклямі, але ў 2015 годзе перарасло ў «нешта большае». Сам пастаноўшчык жартуе, што заняць пасаду галоўнага рэжысёра яго прымусілі гвалтам, аднак насамрэч, як часта бывае ў падобных сітуацыях, у справу ўмяшаліся знешнія абставіны ці, калі хочаце, папросту лёс.

У рэшце рэшт, супрацоўніцтва, мяркуючы па рэпертуарнай гісторыі, абярнулася ўзаемавыгадным пачынаннем. Апошнія гады добрую частку афішы фарміруюць менавіта работы пастаноўшчыка. У сваёй працы рэжысёр, як відаць, не ў апошнюю чаргу грунтуецца на спадчыне і запаветах першапачатковага тэатра драмы «Дзе-Я?». Наўпрост з тых часоў у сучасныя пастаноўкі перайшла, напрыклад, адмысловая інтэрактыўнасць, свайго роду трохмернасць дзеяння. Мяжа, якая аддзяляе сцэну ад глядзельнай залы, па меркаванні творцаў, уяўная і можа быць лёгка пераадолена. Гэтак жа лічылі і пачынальнікі «Дзе-і».

Сёння падобныя рэчы выяўляюцца праз лёгкае, але ў той жа час дастаткова элегантнае парушэнне

Сцэна са спектакля «Як я стаў...», 2015 г.

чацвёртай сцяны ў некаторых спектаклях (напрыклад, у свежым «Хамсіне» героі ў нейкі момант пачынаюць шалёна гойсаць вакол гледачоў, што вельмі моцна ўражвае апошніх)… У працяг тэмы: з таго часу мала змянілася і рэпертуарная палітыка. У выбары матэрыялу для пастаноўкі перавага аддаецца нетрывіяльным аўтарам ды, акрамя таго, нярэдка беларусам. Тут ставіліся п'есы і Георгія Марчука, і Андрэя Курэйчыка, і, з нядаўняга, Валянціна Пепяляева (яго іранічны «Нобелеўскі тыдзень» і сёння ў афішы)…

Што ж, прайшоўшы вялікі шлях ад беспрытульнай маленькай студыі да паўнавартаснай стацыянарнай установы, Новы драматычны тэатр і цяпер не стаіць на месцы. Лозунг юбілейнага сезона «Скрозь час» яскрава пацвярджае дадзены тэзіс. І няхай баявы дух творчых работнікаў, па словах мастацкага кіраўніка, апошнім часам крышку аслабеў (у сувязі з пандэміяй), наперадзе іх усё роўна чакае яшчэ не адно вялікае здзяйсненне. У хуткім часе мае адбыцца шараговы маштабны рамонт, а на найбліжэйшую будучыню, калі ўсё складзецца ўдала, запланавана правядзенне ўзнагароджання найлепшых артыстаў.

Не дадуць акцёрам засумаваць у такі складаны час і цікавыя спектаклі ад новых маладых пастаноўшчыкаў. Сяргей Кулікоўскі, пакінуўшы пасаду галоўнага рэжысёра, вызваліў месца для новых творцаў. Кампанію яму складаюць артыст Арцём Пінчук, адначасова заняты ў многіх спектаклях, і пачаткоўка Лізавета Машковіч, якая адказвае за рэжысуру «Вадэвіляў». Абодвух пратэжыруе Сяргей Міхайлавіч. Жадаем калектыву Новага тэатра творчых поспехаў і адкрыццяў! Віншуем з юбілеем!

Мікіта ШЧАРБАКОЎ
Фота з архіва тэатра

Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.

Сезонная псіхатэрапія

Упадборцы Алы Клемянок пад назвай «У пошуках радзімае душы», што адкрывае кастрычніцкае «Полымя», тонкая лірыка адлюстравання маляўнічых восеньскіх краявідаў паяднана з інтымнай настраёвасцю любоўнай тэматыкі. Стварыць карцінку пры дапамозе апісальна-вобразных прыёмаў — тое, што аўтарцы ўдаецца, здавалася б, без напружання, але гэта не значыць, што карпатлівай працы не было — яна проста схавана ад чытацкіх вачэй:

Дзве душы, абняўшыся, спявалі,
Там, дзе верш пад месяцам саспеў.

Паэтэса спрабуе агучыць спрадвечную жаночую мару:

А я стамілася быць дужай,
А я хачу на свята ружы…
<…> бязмежнага над дахам неба,
Надзейнага пляча ад мужа,
З якім не трэба мне быць дужай…

І ў дадзеным выпадку гэта вымушае задумацца над адным з асноўных пытанняў, што тычыць сутнасці паэзіі: ці падзяляецца яна на жаночую і мужчынскую? Ці павінны нерэалізаваныя памкненні так напрасткі заяўляць аб сабе, апранутыя ў рыфмы і пакладзеныя на рытм?..

У падобным тэматычным рэчышчы працуе і паэтэса Людміла Кебіч: назва яе лірычнай падборкі — «Сімвал кахання і веры» — сведчыць сама за сябе. Асноўныя дамінанты ў творах — каханне (апошняе, бясконцае, як звышпачуццё), жаночы лёс, слёзы, жарсці, мужчына, душа, сустрэча:



На беразе растайнага світання
Прысяду, каб рашэнне саспяліць:
Разыдземся з табою без вагання
Ці будзем жыць далей ды слёзы ліць?
(верш «На беразе кахання»)

Адна з надзвычай важных уласцівасцей адпаведнай паэзіі ў тым, што яна можа быць псіхатэрапеўтычным сродкам для аўтара, каталізатарам пэўных настрояў… Але вось пытанне, над якім аднойчы задумваецца творца: ці можна намаляваць, напрыклад, дождж, не выяўляючы патокаў вады, што лятуць долу?..

Падобная мінорная настраёвасць, толькі як быццам прыглушаная, размытая ў пастэльных тонах, і ў лірыцы Аляксандра Быкава. У нізцы вершаў, аб'яднаных пад назвай «Мая самота светлая», лірычны герой перажывае восень ва ўласным існаванні — і гэта атрымліваецца сугучным восеньскай паравіне года ў каляндарным цыкле, што толькі ўзмацняе галоўны пасыл. Шэдэўрам бачыцца першы верш публікацыі — «Размова з масніцай». Як таленавіты мастак, выразна (але без мудрагелістасці) акрэсліўшы пару дэталяў, можа стварыць яскравы завершаны вобраз, так і ў гэтым творы: праз сціплую дэталь, без ляманту, перадаецца ўнутраны стан апавядальніка.

Проза пад вокладкай часопіса разнапланавая і шматтэмная. З цікавасцю чытаецца гістарычная аповесць Уладзіміра Мажылоўскага «Меч Агрыка», прыгодніцкая і захапляльная, падзеі ў якой закручваюцца ў XIV стагоддзі на айчынных землях. Аўтар верны сваёй заўсёднай творчай манеры: напружанне і інтрыга ў сюжэце не адпускаюць ад першай да апошняй старонкі. Пэўная доля містыкі, прывіды, цудадзейны меч, высокі драматызм неверагодна моцных пачуццяў — менавіта на гэтых рэаліях грунтуюцца аўтарскія мастацкія прыёмы.

З цыкла «90-я» аповесць Анатоля Разановіча «Падаў снег». Героі яе вырашаюць маральна-этычныя пытанні: здрадзіць ці застацца верным, адпомсціць ці дараваць, адпусціць мінулае ці змірыцца з яго прысутнасцю...

На ўспамінах грунтуецца аповед Міколы Мятліцкага «Сполахі даўніх зарніц».

Тадора ШПІЛЬКА

У полымі запалкі...

Кастрычніцкі нумар «Нёмана» пачынаецца з апавядання Генадзя Дароніна «За падкладкай». Аб чым расказвае аўтар? Здаецца, кожны чытач знойдзе і зразумее нешта сваё. Пра сон ці жыццё, якое падобна на сон, або цэлую гісторыю, што, як фотакартка, схавалася за падкладкаю. «Бывае, што, прыкурваючы раніцай, спальваеш у полымі запалкі тры галактыкі... Іх, вядома, шмат, усе не спаліш, але як жа быць з надзеямі на шчасце, з высокімі духоўнымі імкненнямі, якімі былі бітком набіты гэтыя няшчасныя галактыкі? Яшчэ тое пытанне... Так што нічога выпадковага не бывае», — разважае Г. Даронін у пачатку твора. Адразу яго думкі не паддаюцца разуменню, а потым, калі ўключышся ў сюжэт, усё становіцца на свае месцы. І, прачытаўшы твор цалкам, вяртаешся да ўступу, які дадае адсутныя пазлы і робіць успрыманне твора цэласным. Сэнс апавядання не на паверхні, а ў глыбіні. Гэтым пошукам твор і вабіць.

Паэзія ў нумары падабрана вельмі ўдала. Лірычная падборка Віктара Шніпа адпавядае агульнаму восеньскаму настрою. Разважлівасць, салодкая тужлівасць, запаволенасць, роздум над вечнымі пытаннямі, над сэнсам існавання чалавека, прага цеплыні, як сонечнай, так і душэўнай, затуманенасць думак і пошук яснага праменьчыка. Восень натхняе зазірнуць за шырму нязведанага. Гэтыя ж матывы адлюстроўвае аўтар:

Как завершенье жизни всей, приходит вечер,
И ты вдруг думаешь о сне, в котором вечность.
Исчезнешь в ней ты, как в сухом песке вода,
И будет ужас твой подобием креста.

Выразна адчуваецца ва ўсёй лірычнай падборцы перапляценне вобразаў — храм, крыж, цішыня, першы снег, вечнасць, ноч, апалае лісце і вечар — вечар жыцця... Вершы В. Шніпа дакладна не веюць аптымістычнасцю, хутчэй — глыбокім роздумам, рэфлексіяй, журбой па страчаным, тым, што называецца апалым лісцем.

Гэтая блізкасць і сугучча вобразаў дазваляюць назваць падборку вершаў «Аднойчы ўжо назаўсёды...» серыяй.

Водгукам на актуальны парадак дня з'яўляецца лірыка Валерыя Грышкаўца «Перадзімоўе. Бальніца...»:

COVID-19. Больница.
И знобкий, ноябрьский рассвет,
Как одурь, на окнах слезится.
Не спится. И сон словно бред.

Аўтар так дакладна перадаў дынаміку хваробы і пачуццяў ад яе, што, напэўна, кожны чытач, які перажыў падобнае, скажа: як жа трапна! Напружанасць, хваляванне, страх і боль В. Грышкавец адлюстраваў з дапамогай парцэляцыі, гульні слоў, умаўчання, ламанага радка, а найбольш — з дапамогай алітэрацыі: «Все в белом. // Но бель эта — с болью, // В глазах — как-то странно черно».

Дынаміка верша прыводзіць да апошняй яго часткі «Папраўка», што рассейвае напружанасць і пасяляе надзею на тое, што з гэтага страшнага сну ў перадзімоўе можна выбрацца, і нарэшце «Отступят смятенье и боль. // И сердце спокойно забьется, // Обрадуют свет и любовь».

У рубрыцы «Літаратурны агляд» Зінаіда Краснеўская дзеліцца з чытачом «Парадамі заўзятага кніжніка». Пад «парадамі» аўтар мае на ўвазе падборку тых выданняў, якія, на думку З. Краснеўскай, абавязкова трэба прачытаць: «Час пачынаць дзяліцца назапашанымі багаццямі. Як? Ды самым простым спосабам: пачаць раздаваць парады. Бо ўсе мы любім даваць парады, ці не так? Нездарма раней нас так і называлі: краіна "советов", — і зусім нават не беспадстаўна, дарэчы». Вельмі цікава пабачыць аргументацыю аўтара, чаму тая ці іншая кніга заслужыла, каб быць «парадай». Прыслухоўвацца ці не — выбар чытача, але наяўнасць такой цікавай і нечаканай падборкі, безумоўна, радуе.

Варта звярнуць увагу і на іншыя празаічныя творы, якія пададзены ў нумары: завяршэнне рамана Генадзя Аўласенкі «Выбраная Сафратай», кнігі Наталлі Ігнаценкі і Аляксандра Радзькова «Маленькія гісторыі вялікай сям'і», а таксама і пачатак аповесці «Няма там запаведзяў дзесяці» Джо Алекса, якая прадстаўляе ў «Нёмане» «Сусветную літаратуру».

Дзіяна КАЗІМІРЧЫК

Дацягнуцца да нябёс

Як перагарнуўся каляндар, так, натуральна, змянілася і надвор'е. Апошнія дні на вуліцы прыкметна пахаладнела: разам з паветрам цяпер выдыхаем пару, а траву ранкамі засцілае іней. Карацей кажучы, за акном ледзь не мароз стаіць, а ў дзясятым нумары часопіса «Маладосць» і дагэтуль па старонках у нейкай макраце плавае лістота… І ўсё такое вільготнае, дажджлівае, а яшчэ, як ні дзіўна, нябеснае… Аўтары свежага нумара неяк асабліва любяць, скажам так, палунаць у аблоках.

Ды нават і вышэй за аблокі: будзьце гатовы і пільна сачыце за персанажамі, каб хутка іх не згубіць. Неўтаймаваныя героі апошняй «Маладосці» сталіся тымі яшчэ летуценнікамі. Увесь час яны будуць намагацца, пакуль ніхто не глядзіць, падскочыць як мага вышэй і, пакінуўшы стратасферу, адправіцца ў падарожжа па ўласных фантазіях — прытым найчасцей у космас да далёкіх зорак (ну, ці хаця б на той свет). І, само сабой, у гэтым парыве ім заўсёды будуць супрацьстаяць розныя перашкоды, у тым ліку сіла прыцягнення Зямлі.

Асабліва незямнымі аказаліся самыя першыя творы ў падборцы. Напрыклад, непрацяглыя апавяданні Аляксандры Кароль «Розныя» і «Сумоўе». Адзін з герояў першага — ці то фізік-тэарэтык, ці то касмолаг, ці то астраном (апошняе найбольш верагодна), для якога, аднак, нябесныя целы цікавыя ў першую чаргу сваімі лічбавымі характарыстыкамі. Затое яго сяброўцы зусім не трэба ніякіх навуковых абгрунтаванняў, і яна цвёрда ведае, што ва ўбыванні месяца вінавата маленькае ваўчаня, якое адкусвае ад яго па кавалачку.

Пэўную, мабыць, мастацкую банальнасць гэтых тэкстаў ураўнаважваюць дзе-нідзе дастаткова ўдала знойдзеныя жарты. Напрыклад, у наступнай сцэне дзеянне адбываецца ў нябеснай канцылярыі дзесьці перад дзвярыма раю. Апостал, вырашаючы далейшы лёс людскіх душ, прамаўляе: «Як дзеці, далібог». А яшчэ высвятляецца, што ў запаветнае месца прапускаюць далёка не ўсіх свяшчэннаслужыцеляў, нават у сане або кананізаваных:

«— Як вы смееце! Я кардынал!

— Ды хоць Папа Рымскі, — стомлена адказваў апостал. — Уніз па лесвіцы ды налева».

Наступнае ж апавяданне ў падборцы ўвогуле так і называецца — «Урокі астраноміі» (Ліна Мрагі)… Вялікія формы прадстаўлены ў апошняй «Маладосці» двума тэкстамі —

дакументальна-мастацкай біяграфіяй Войслава Савіча-Заблоцкага «Напярэдадні» (Наталля Бахановіч) і працягам рамана «Чорны бусел» (Алесь Кажадуб). Ад сваіх слоў не адракаемся: «Чорны бусел» — гэта па-ранейшаму ўсё так жа бойка, ладна, бадзёра. Дэбютантцы ж Наталлі Бахановіч яшчэ шмат давядзецца адточваць свой стыль, але і цяпер тэкст паўстае вельмі ўпэненым, напісаным, як кажуць, цвёрдай рукою.

Сярод кастрычніцкай паэзіі асобна выдзяляюцца вершы маладой Яраславы Федчанкі. Нягледзячы на некаторыя стылістычныя недахопы і пэўны наіў, зроблена ўсё ж дужа густоўна. Рыфмы часцяком мала таго, што не збітыя, дык яшчэ і зусім не натужлівыя, як у такіх выпадках нярэдка бывае. Дарэчы, ізноў лірычны герой блукае недзе ў аблоках, ідучы за сваёй мараю. Мілагучнасцю і выпрацаванай мовай адзначыліся вершы вопытнага аўтара Уладзіміра Ясева. Завяршаюць паэтычную падборку творы Таццяны Барысюк.

Мікіта ШЧАРБАКОЎ

Этымалагічныя эцюды*

З кнігі «След самаеда»

Буг, Быхаў

Буг — гэта плынь, гэта рака. Яго найменне тэрміналагічнае і вытлумачваецца проста, але вытлумачваецца мовай, што сталася далёкай, — нганасанскай, адной з самадзійскіх. На нганасанскай мове рака *бигай*, плынь *буо*.

Некалі гэтае агульнае найменне стасавалася і да іншых рэк, што мелі свае асабовыя найменні, таму далёка ад Буга, за сотні кіламетраў, яшчэ сустракаюцца тапонімы, як Пабужжа (у Веткаўскім раёне ды ў Бранскай вобласці), Дабужа (у Быхаўскім, Рэчыцкім, Светлагорскім раёнах і ў Калужскай вобласці), Прыбужжа (у Дрыбінскім раёне) і Прыбуж (у Пскоўскай вобласці). Апрача Заходняга, ёсць яшчэ Паўднёвы Буг, што цячэ па тэрыторыі Украіны, і Буг, што цячэ па тэрыторыі Расіі ў Рэспубліцы Башкартастан, Пермскім краі, Рэспубліцы Татарстан.

З апелятывам *бигай*, у сваю чаргу, суадгукаюцца айконім ‘Быхаў’ — горад на Дняпры, патамонім ‘Быкаўка’ — рачулкі ў Гомельскім і Чавускім раёнах.

Трылес, лес

Трылес, Трылесы, Трылесіна, Трылессе, Трылескі… Аснова назваў відавочная: тры лясы, тры лясіны, кажа той, хто з імі знаёміцца. Мусім дадаць: яна занадта відавочная, ляжыць на паверхні і таму ў вытлумачэнні найменняў тапоніма проста павярхоўная. Вось жа, калі ёсць тры лясы, мае быць і два, але такіх тапонімаў няма: ні Двулесся, ні Двулесіна, бо ў аснове найменняў гэтых тапонімаў не ‘лес’, а аддзеяслоўны самадзійскі субстантыў *илесь’* — ‘жытло’.

Што тычыцца першага кампанента, то гэта, хутчэй за ўсё, метатэзаванае слова *тир”*, дзе літары, каб слова, упісваючыся ў іншую моўную сістэму, набыло нейкі свой змест, займелі перастаноўку. На ненэцкай мове *тир”* — грудок, пагорак, больш высокае месца ў параўнанні з наўкольным ніжэйшым. *Тир” илесь’* — так напачатку называўся Трылес і разам з гэтым атэстоўваўся, казаў, што ён жытло (жытлішча) на ўзгорку. Да іншых суадпаведных словаформаў дадаліся афіксы.

А цяпер вяртаемся да слова ‘лес’.

На беларускай мове *лес*, на рускай *лес*, на ўкраінскай *ліс*, на польскай *las*, на верхнялужыцкай *lěs*, на ніжнялужыцкай *lěso*, на славацкай *les*, на чэшскай *les*, на стараславянскай *лѣсъ*. Адкуль паходзіць гэтае слова і што азначае яго фонасемантыка? Найбольш пераканаўчай лічыцца версія, што атэстуе ‘лес’ як будаўнічы матэрыял ці як паліва і суадносіць яго з лацінскім *lignum* (‘драўніна’, ‘бервяно’, ‘палена’). Аднак сам ‘лес’ і фанетычна, і семантычна суадносіцца не з ім,

а са словаформай, што на ненэцкай мове азначае ‘жытло’, — з тым самым *илесь’*. Там, дзе пасля засілля ледавіка ўзнікаў лес, зямля ажывала, ачуньвала, зелянела. І сам лес станавіўся асяродкам жыцця, жытлом і прытоннем для разнастайных істот, у тым ліку для чалавека. У слоў *лес*, *илесь’* і *иледана(сь)*, што на ненэцкай мове азначае «зелянець», адна і тая аснова, а ў шматлікіх тапонімаў, «прышпіленых» да ‘лесу’, першапачатковы апелятыў *илесь’* — ‘жытло’.

* Працяг. Пачатак у №№ 24, 27, 30, 32, 36, 37, 40.

Вільня

Як сведчаць археалагічныя знаходкі, першым, выяўленым на тэрыторыі Вільні паселішчам, — дзясяткі тысяч гадоў, яны адносяцца да эпохі мезаліту.

Хто іх засноўваў, хто насяляў і адкуль узялося найменне ‘Вільня’? Паспрабуем дапытацца ў самога найменя.

Даследчыкі сыходзяцца на думцы, што Вільня займела сваё найменне ад назвы ракі Вільні, левага прытоку Віліі, альбо самой гэтай ракі. *Вілія*, *Вялля*, *Велья*, *Велея*, *Велия* — вось вядомыя варыянты яе назвы, што вытлумачваецца як ‘вялікая’. На тэрыторыі Літвы Вілія набывае найменне *Neris*, якое мовазнаўцы зазвычай суадносяць са словам *nerti* — ныраць. Як адгалінаванне ад версіі ці ў дадатак да яе згадваюца яшчэ і *vėlė* — душа нябожчыка, і *velnias* — д’ябал.

На гэтым і славянскія, і балцкія версіі спыняюцца, а найменне ‘Вільня’ застаецца невытлумачаным. Калі яно паходзіць ад найменя ракі Віліі, то ад якой яго формы: калі ад *віл*, то ў ёй няма ‘вялікасці’, а ёсць ‘вілы’, калі ад *вел* (*вял*), то ў ёй няма ‘Вільні’. Тым больш рэкі з такою назвай цякуць і ў іншых краях (так, Вілія — рэчка ва Украіне, прыток Цецерава, яшчэ адна Вілія — прыток Гарыні), і азначэнне ‘вялікая’ да іх як бы не стасуецца.

Калі ж яно паходзіць ад найменя другой ракі, Вільні (Вілейкі), то застаецца невытлумачанай сама яго марфалогія: што азначае марфема *віль* (яна тая самая, што і ў найменя ‘Вілія’, ці не тая самая, суадносіцца са словам *vilnis*, што на літоўскай ‘хваля’, ці не суадносіцца) і што азначае марфема *-ня*.

Мая версія самадзійская: Вільня займела сваё найменне ад *иленя* (варыянт *илена*) — слова, што ў ненэцкай моўнай сістэме мае некалькі значэнняў. Першае, ці нават адзінае, — гэта жыхар, насельнік, насельніцтва (множны лік *иленя”*). Другое, у спалучэнні са словам *и”*, што само па сабе азначае ‘вада’ (разам *иленя и”*), — гэта крыніца, літаральна ‘жывая вада’. І вось яна, крыніца, ‘жывая вада’, некалі, у даўняй даўніне, бадай, і стала тым цэнтрам, той асновай, што паклікала да сябе людзей, аб’яднала іх, вакол якой утварылася насельніцтва.

‘Вільня’ адвязваецца ад рэк, ад Віліі і Вільні, затое яны, прынамсі другая, прывязваюцца да яе: у яе таксама ‘крынічная’ назва. ‘Крынічнае’, а не ‘рачное’ паходжанне і ў вёскі Вільна, што ў Невельскім раёне Пскоўшчыны, за паўкіламетра ад яе знаходзіцца аднайменнае возера: сваю назву яна атрымала ад яго. Што тычыцца вёскі Віленіцы (месціцца на рацэ Мста ў Любыніньскім раёне Наўгародчыны, на яе тэрыторыі бяруць пачатак некалькі рачулак), то яе найменне можа вытлумачвацца як ‘крынічнай’ фонасемантыкай (*иленя и”* + катайконім *-ицы* (*-цы*), што мае азначаць ‘крынічане; пасяленцы каля крыніцы’), так і ‘жыллёвай’ (*иленя”* + *-ицы*: папросту ‘жыхары’). Славенская Віленіца, вядомая дзякуючы карставай пячоры як ‘Яма Віленіца’ (‘*Jama Vilenica*’), у сваім найменні мае відочна ‘жыллёвую’ фонасемантыку: ім яна мелася сказаць і казала, што ‘яма’ заселеная, што яна мае жыхароў; нябесныя істоты вілы, што калі-нікалі ўводзяцца ў вытлумачэнне айконіма, адно спараджэнне ўявы. І яшчэ вёска Віленка: вёскі з такім найменнем сустракаюцца і ў Беларусі, і ў Расіі, і ва Украіне. У аснове яго словаформы тыя самыя ‘жыхары’, але з удзелам імяпамяншальнага суфікса *-ко*.

Вільня багатая на крыніцы. Якая з іх была асноўнаю, хай вырашаць краязнаўцы. Магчыма, тая, што цякла па вуліцы Вінгру і з якой утваралася рэчка Качарга, што, у сваю чаргу, упадала ў Вільню, ад чаго тая станавілася ‘крынічнай’ ракой. Дарэчы, *Nota Bene* ў дачыненні да вытлумачэння літоўскага суадпаведніка Віліі: на нганасанскай мове *нери* — выток ракі, а на ненэцкай *неро* — вербалоз, ракітнік, суадпаведна *Neris* — рака, зарослая ракітнікам, вербалозам.

Што тычыцца фанемы ‘в’ у слове ‘Вільня’ (як і ў згаданых ‘Вільна’, ‘Віленіцы’, ‘Віленіца’, ‘Віленка’), то яна пратэтычная: слова займела яе вымаўляючыся; замест спіранта *j*, што адпачатку прысутнічаў у слове (вымаўляецца *йиленя*), пачаў вымаўляцца спірант *в*.

Нёман, Майн, Рэйн

Па-беларуску Нёман, па-літоўску Nemunas, панямецку Memel, яго даўжыня 937 км. Не буду пералічваць версіі, што вытлумачваюць яго найменне, падзялюся самадзійскай. Яна кажа, якая гэта рака. На нганасанскай мове *Немы”ыа* — вялікая рака: Нёман заслугоўвае гэтае найменне і ў ім пазнаецца. Ён услаўляецца ў песнях, і калі гаворка вядзецца пра Літву, то яе яшчэ наймяноўваюць *Nemuno kraštu* — Нёманскім краем, а калі пра Беларусь, то да яго

найменя зазвычай яшчэ дадаецца назоўны эпітэт: ‘бацька Нёман’. ‘Бацька’ па-беларуску, ‘маці’ па-самадзійску: на нганасанскай мове *немы* — маці.

Гэта першая версія паходжання найменя ‘Нёман’, другая ідзе ад саамскай мовы. Ёю ў словаформе найменя выяўляецца лексема *нёмм* і лексема *яан* (*еан*). Першая прыметнік, яе значэнне ‘павольная, марудлівая’, другая назоўнік, яго значэнне ‘вялікая рака’. Нёман — *Нёмм яан*: павольная вялікая рака. У гэтым сваім найменні Нёман мае сваю атэстацыю, як бачым, яна суадпаведная.

Якая з гэтых версій прычынілася да паходжання найменя ‘Нёман’, магчыма, вызначыцца тады, калі больш-менш акрэсліцца арэалы колішняга бытавання прасамадзійскіх моў і гаворак: ва ўсякім разе ‘Нёман’ ад іх.

Лексема *яан*, суадгукаючыся са словам *манн* (*ман*), што азначае шырокі плёс ракі і шырокае праточнае возера, суадносіцца з найменнем ракі Майн, а таксама з найменнем ракі Рэйн (на нямецкай *Rhein*, французскай *Rhin*, галандскай *Rijn*). Першай лексемай у словаформе гэтага тапоніма выяўляецца саамскае слова *райи* (*райе*) — ‘мяжа’. Такім чынам, Рэйн — *Райи яан*: ‘мяжа — вялікая рака’.

Алесь РАЗАНАЎ

Працяг будзе.

«Налітыя сонейкам ноткі...»

Травелогі[1]



Валерый КУХАРЧУК

* * *

У Юціцы мятуць ізноў снягі,
а ў Дэсціне — цудоўнае надвор'е.
Лагодны снежань. Гушкалка з папкорнам.
І яшчарка-гарэза ля нагі.

Люляе разняволены рызорт,
пакуль у калаўроце мітуслівым
на показ Мексіканскаму заліву
наш пляжны выпраўляецца эскорт.

Наіўны гід шыбуе напрасткі,
яму б хутчэй даклыпаць да ўзбярэжжа.
А мне б прыстаць. Каменьчык пятку рэжа.
А мне б адскрэбсці пальму ад лускі.

Пакуль дзявяты вал мой даімчыць —
паспею і надоечы, і прысна
вачыма адмаргаць салёны прысак
і ногі ў акіяне памачыць.

Вінаграднікі Пенсільваніі

На сямідзясятай мілі,
да якой разагналі
таётавы колы
штрыхкодавую стужку
платнай дзевяносткі,
узбочыны аўтабана
падобны разапнутаму вееру
з малахітава-бэзавымі
пражылінамі
лапушыстай лазы.
А яшчэ вінаграднік
нагадвае дэку
агромністых цымбалаў
з нацягнутымі струнамі
ажно да мроіва
далягляднych надгор'яў.
Ці не!
Хутчэй гэта будзе
перакуленая арфа.
Бо нельга па струнах
жагаць цымбаловымі палачкамі —
асыплюцца долу
налітыя сонейкам ноткі.
Яны ўжо пяюць, загучалі
ад дотыкаў віртуозных
натхнёнага маэстра-ветру.
Шкада толькі —
слухаць мелодыю
перашкаджае
суладдзе гамонкі
колаў і рухавіка.
І раптам.
О, вось яно — адкрыццё!
Аказваецца, музыку
можна кратаць вачыма!..

Спалены рай

Над Каліфорніяй
зноў дымы.
Зноў ніхто
не прызнаў віны.
Нават спалены Paradise[2]
немым енкам ахвяр
не паўстаў засцярогай
ад тэхнагеннага гвалту.
Зырка папялее зямля
галівудскіх мрояў.
Тэрмінатар — і той
спехам кінуў раскошу
палатаў-басейнаў
сваёй суперзоркавай вілы,
не згадаўшы на развітанне
знакамітае
«I'll be back»[3].
Здань грахоўнага крыла
павісла над Горадам Анёлаў.
Што ўратуе яго
ад плазмы каліфарнійскіх лясоў?
Можа, хоць бы часовае
прымірэнне
карпарацыйных інтарэсаў
ды палітычных інтрыг?
Не бывае страшней злачынства,
чым мясцова-гібрыдны
тэрарызм.
А прырода сама
паддае чалавеку падказкі
прыкладам
рысянятка ды аленяняці,
што, забыўшыся
на спаконвечную варагавітасць,
затуліліся разам
пад ратуючай накрыўкай
камп'ютарнага стала
ў палаючым горадзе-раі.
...І неба злітасцівілася.

* * *

Падсмажаная на мангале
якуцкай тайгі,
прыпраўленая селем
смяротнага еўрапатону
з усходу
вылупіла зенку
чырвоная поўня.
Ад калаўроту
незлічоных зямных анамалій
цісне кроў
яе вокавага дна.
Наліваюцца капіляры
жахамі неўтаймоўнага агню.
Лопае крыватокі
пачварнасць воднай стыхіі.
Адно калі поўня
ўзышла над рахманасцю
соннага горада —
чырвань пачала сыходзіць.

* * *

Паўсюдна — немцы[4].
А гэта значыць —
усе тыя,
што не па-нашаму
кажуць.
І я таксама —
найпершы немец
для тых усіх,
хто не па-нашаму
кажа.

---

[1] Травелогі — паэтычныя падарожныя нататкі або дзённікі.

[2] *Paradise-city* — назва горада ў штаце Каліфорнія, ЗША; у перакладзе з англійскай мовы — рай.

[3] *I'll be back* — я вярнуся (з англ.).

[4] Немцамі ў старажытнай Русі называлі ўсіх іншаземцаў, якія размаўлялі на замежнай мове.

Восеньская спадчына

Віктар ЯРАЦ

* * *

Без густога рэшата прасейвае
між хмурын святлінкі вышыні
неба ці душа парой асенняю,
як ніжэюць, халадзеюць дні?

* * *

Цяжка дыхае восень начамі.
Ацалелы на гольцы ліст
вышыня прывучае
не баяцца сарвацца ўніз.

Лебедзі ў затоцы верасня

Нячутна ходзіць сонца па вадзе
і раску колкую не абмінае бокам,
і пералётнай светлынёю дзень
кладзецца з варажбой на дно затокі.
Паміж дняпроўскай плынню і дуброў
яшчэ ўцалелым востравам зялёным
павольна-ціха птушкі зноў і зноў
глыбіням доўгіх шыяў шлюць паклоны.
І нават хмарка можа светлай быць,
калі пад небам ветраным і золкім
ты ведаеш, што ёсць каго любіць
і з кім дзяліць маўчанне і гаворку.

* * *

Зорка малілася рэчцы вячэрняй,
поўнаю даўняю тайнаю верай.
Лашчыла неба чыстыя лікі
плёсам — іконам вякоў без падліку.
Слухалі споведзь і блізкія сосны
стромы надрэчнай.
Агеньчыкам познім
Позняе лета ў прасторах гукала
Цёплыя гукі позніх вакзалаў...

* * *

Сярэдзіна кастрычніка.
Прычоскі дзьмухаўцоў
ніяк не могуць развітацца з небам.

* * *

Прыбраў магілы мамы й бацькі на Пакрову.
Дзень сонцам частаваў —
кароўкам божым на гулянне-радасць.

Чыёй душой чырвоны матылёк
узнік, нібы падзяка на расстанне, —
пытаць не трэба ні ў зямлі, ні ў неба.

Да першых завей

Абветраны дзень завітаў дагукацца
да слоў ля акон анямелых
схуднелай лістотай бяроз і акацый,
што першую крыгу пачулі
да першых завей
каранямі ў падзоле —
стагоддзяў мазолістых целе.

* * *

Дыханнем родным адгукнецца міг
і запытае глыбінёй глыбокай:
— Што ў мітусні і ў грукаце спасціг
у гарадах і блізкіх, і далёкіх?

З галіны грушы-дзічкі ціўкат свой
шле верабей аб нечым — можа, вечным,
ці прывітальнай хоча цеплынёй
сагрэць маўчанне веснічак
і ў гэты золкі вечар?

Фота Кастуся Дробава.

* * *

Прыдумка душ людскіх:
дух ідзе ў вышыні
на арэлях ветравых
пагайдацца ў сіні...

* * *

На заінелым акне
позняя водмелі сонечнай поймы
прыпомняць у холад ці не
дзень, гудзеннем пчаліным поўны?

Зарачанка

Зарачанка, вянчанка дасвецця
і вячэрняй зары за ракой,
успаміну дазволь адагрэцца
хоць на міг і сцюдзёнай парой.

І праз лета ляцяць, і праз восень,
і праз вецце ад вокнаў тваіх
словы з ягадным сокам і ў росах
захмялелых палян баравых.

І на кожнай калючай іголцы
мякка ветру прыгадваць свой шлях,
і, не помнячы ўзросту, зноў сонца
па тваіх лёгка ходзіць слядах.

Позняя сюіта

Лісток бярозы, супакойвай
рабіны гронку — да завей
ёй воблакі ў журбе і ў коме
не абмінаць святлом надзей.

Лісток — настройшчык струн світання —
і разам з ім агучвай мне
не чорнай хмары хваляванне —
выток, дзе музыка жыве.

Рабіны гронка, не гаркотай
свет прывітай, дзе не паспеў
апошнія лістоты ноты
скаваць мароз на гольках дрэў.

ЗЭКавычкі-7

Каляліtаратурныя былі

Анатоль ЗЭКАЎ

За тры гады да нараджэння

На сустрэчы ў Смілавіцкай гарпасялковай бібліятэцы вучні чыталі на памяць мае вершы. Пасля таго, як скончылі спецыяльна падрыхтаваныя выступоўцы, настаўніца запытала:

— Дзеці, можа, яшчэ хто вывучыў верш Анатоля Мікалаевіча?

З месца ўзняўся хлапчук:

— А можна я з кнігі прачытаю?

— Чытай! — амаль у адзін голас выгукнулі і я, і настаўніца.

Хлапчук выйшаў да дошкі з маёй кнігай пародый «Кругі ў галаве», за якую я атрымаў «Залаты Купідон», і сказаў, што некалі яе набыла яго родная цётка:

— Пісьменнік прыязджаў у школу, калі цётка была ў дзясятым класе. На кнізе ёсць нават аўтограф.

Пасля таго, як вучань прачытаў пародыю, я папрасіў у яго на хвілінку кнігу. Адгарнуў — і ўбачыў пад аўтографам дату: 2008 год.

— А ты калі нарадзіўся? — зацікавіўся я ў хлапчука.

— У 2011-м, — адказаў той.

Вось так: за тры гады да нараджэння пляменніка цётка ўжо мела маю кнігу. Каб у 2020-м перадаць яму і тым самым вярнуць мяне на дванаццаць гадоў назад.

Пячэнне на дарогу

Выступілі ў Валевачоўскай сярэдняй школе Чэрвеньскага раёна і ўжо збіраліся ад'язджаць у Мінск.

Раптам у школьным двары да нас падбягае вучань, які быў на сустрэчы, і працягвае мне паўпачкі пячэння — такую порцыю даюць ім да абедзенай гарбаты.

— Сам з'еш, — кажу яму.

— Я ўжо наеўся, — адказвае хлапчук.

— Ну, потым з'ясі, — прапаную.

— Ды я ўжо дамоў іду, вунь хата праз дарогу, а вам жа яшчэ да Мінска ехаць, — як бы спачувае наш «кармілец».

Клас паэтаў

У Патапаўку, дзе на той час быў я, патэлефанавала Алена, пляменніца са Жлобіна. Сказала, што настаўніца рускай літаратуры дала заданне вучням класа, у якім вучыцца і яе сын Артур, скласці верш аб прыродзе. Папрасіла дапамагчы: напісаць такі верш для Артура ці знайсці нешта ў іншых паэтаў. Маўляў, і сама б магла адшукаць у інтэрнэце, але раптам той верш вядомы настаўніцы ці яшчэ нехта яго «напіша». Я напачатку не пагадзіўся быць паэтам у Артура, спаслаўшыся на тое, што па-руску не пішу, ды падумаў і вырашыў усё ж дапамагчы родзічу. І, стаўшы ў позу шасцікласніка, напісаў даволі немудрагелістае заказаных памераў васьмірадкоўе:

Утром солнышко восходит
И играет день со мной.
Оживление в природе
Начинается весной.
Под лучами солнца тает
Выпавший за зиму снег,
Птички с юга прилетают
И поют свой гимн весне.

Артуру пашанцавала, што яго дзед — паэт. А хто напіша вершы іншым вучням?

Падумаў і пра настаўніцу, якая дала ім такое, на маё разуменне, недарэчнае заданне. Няўжо яна і насамрэч думае, што можна вырасціць цэлы клас паэтаў?

Куды ехаць?

Неяк сябры-паэты дапазна заседзеліся ў адной рэдакцыі. Пілі гарэлку, вялі гамонку пра літаратуру і знаёмых пісьменнікаў, спрачаліся. Каб раз'ехацца па дамах, выклікалі таксі.

З памяшкання вываліліся, аднак застольныя дэбаты не скончылі. Доўжыліся яны і пасля таго, як уладкаваліся ў салоне таксі.

Таксіст пачакаў з якую хвіліну, а потым, бачачы, што ніхто з пасажыраў і не збіраецца называць адрас прызначэння, пытае:

— Куды ехаць?

— А табе якая справа? — пытаннем на пытанне адказвае адзін з пасажыраў.

Хто на што вучыўся

Дачка маёй знаёмай прачытала аповесці Андрэя Федарэнкі «Шчарбаты талер» і «Афганская шкатулка». Ведаючы, што я добра знаёмы з аўтарам і нават працуем у адным выдавецтве, заказала мне аўтограф ад аўтара.

Узяў кнігі, падышоў да Андрэя.

— Падпішы, — папрасіў, назваўшы імя і прозвішча юнай прыхільніцы яго таленту.

— А што ёй напісаць? «З найлепшымі пажаданнямі»? — зірнуў на мяне Андрэй.

— Ну, не так казённа, а што-небудзь цяплейшае, — і прадэкламаваў услых: — Нешта накшталт: «Няхай жыццё тваё будзе расквечана ўсімі колерамі вясёлкі».

— Во-во, так і напішу. Дыктуй! Як ты так прыгожа ўмееш! А я вось не люблю падпісваць кнігі. Не ведаю, што пісаць, — роздумна ўздыхнуў Андрэй.

— Кожнаму дадзена сваё. Як кажуць, хто на што вучыўся, — сказаў я. — Нехта можа пісаць цудоўныя кнігі, а нехта — іх падпісваць.

— А лепш, калі можаш і тое, і другое, — усміхнуўшыся, падбадзёрыў мяне Андрэй.

Калі чароўнай, то кожнай

На сустрэчах з чытачамі кожнаму, хто набыў маю кніжку і падыходзіць па аўтограф, стараюся зрабіць арыгінальны надпіс. Ведаю ж, што потым будуць цікавіцца адзін у аднаго: «А што табе напісаў пісьменнік?» І расчаруюцца, калі пабачаць у першага ж запытанага аднолькавы надпіс. А так маё пажаданне кожнаму стане тым часам як бы і пажаданнем для ўсіх.

Для дзяўчынак, праўда, я пачынаю свой надпіс на кнізе аднолькава: «Чароўнай…» — і далей імя і прозвішча персанальна.

А з памяці не выходзіць адзін выпадак: пасля сустрэчы, калі я, пакінуўшы ўжо ўсім жадаючым аўтограф, стаю размаўляю з настаўніцай, раптам бачу, як каля адной дзяўчынкі тоўпяцца аднакласніцы, а тая сядзіць нейкая засмучаная. Падышоў, зазірнуў у разгорнутую перад ёй кнігу і ўсё зразумеў: аказваецца, перад яе імем і прозвішчам не хапала аднаго слова — таго, якое было ва ўсіх астатніх дзяўчынак (і як гэта я дапусціў такое?).

— Дай мне сваю кнігу, — папрасіў. — То ж я ў спешцы не ўсё табе напісаў.

Дапісаўшы слова «Чароўнай», падаў кнігу засмучанай дзяўчынцы і, адыходзячы, заўважыў, як яна ўсміхнулася. Мабыць, і мне таксама.

Эх, памылкі…

У наш час кожны, хто навучыўся больш-менш складаць словы ў сказы, маючы грошы ці знайшоўшы спонсара, можа выдаць кнігу ў прыватным выдавецтве. І выдаюць. Дзе пераважна самі і аўтары, і рэдактары, і карэктары. І з помпай прэзентуюць, і прадаюць. І ў кнігарнях, і ў шапіках «Белдруку» і «Белпошты». А такую кнігу чалавеку адукаванаму і ў рукі брыдка ўзяць.

Асабліва прыкра, калі з памылкамі — арфаграфічнымі і стылістычнымі — выходзяць кнігі ў дзяржаўных выдавецтвах. А там жа, здавалася б, працуюць прафесіяналы сваёй справы. Цікава, ці дужа перажываюць яны, калі выявяцца памылкі?

А я ўспамінаю, як перажывалі карэктары газеты «Чырвоная змена», у рэдакцыі якой у другой палове васьмідзясятых гадоў мінулага стагоддзя я працаваў намеснікам рэдактара. Бывала, зойдзеш раніцай у карэктарскую, а жанчынкі сядзяць з такімі змрочнымі тварамі — як кажуць, цямнейшымі, чым ноч. Запытаеш: «Што здарылася?» — пераглядваюцца, не адразу і адважваюцца сказаць, што ў нейкім артыкуле новага нумара газеты літару прапусцілі ці коску не паставілі…

Пародыі: хто на каго?

Нярэдка на сустрэчах чытачы задаюць мне пытанне: «Ці крыўдуюць паэты, на якіх вы пішаце пародыі?» Адказваю, што асабіста ніхто мне крыўды не выказваў. Ведаючы ж, што свае пародыі я пішу на таленавітых і вядомых паэтаў, чые вершы падабаюцца мне асабіста, некаторыя творцы жадаюць самі трапіць у гэты спіс. Адна вядомая паэтка пры кожнай сустрэчы просіць, каб я напісаў на яе пародыю, хоць у мяне іх на гэтую паэтку і так ужо некалькі. А іншы менш вядомы паэт неяк уручыў мне ледзь не цэлы вучнёўскі сшытак выпісаных са сваіх вершаў радкоў са словамі: «Можа, спатрэбіцца для якой пародыі. Я ж не думаю, што ты прачытаеш мой зборнік».

Зрэшты, нямала пародый напісана і на мяне. У ліку аўтараў — Георгій Юрчанка, Міхась Пазнякоў, Віктар Шніп, Мікола Шабовіч, Дзмітрый Пятровіч, Аляксандр Быкаў, Міхась Болсун, Валерый Шыханцоў і іншыя.

А, бадай, першым спарадзіраваў мяне яшчэ ў студэнцкія гады Анатоль Сыс. Неяк на літаб'яднанні ў Гомельскім дзяржаўным універсітэце, ведаючы яршысты характар маладога паэта, я прапанаваў яму паспрабаваць сябе ў жанры пародыі, якія ўжо тады пісаў сам. І на наступнае пасяджэнне Анатоль прынёс пародыі на… мяне. Потым і апублікаваў іх у «Дні паэзіі» пад псеўданімам Толік Ганарар.

А я мару выдаць зборнік, у якім асобны раздзел складалі б пародыі на мае вершы. Так што, парадысты, пішыце!

З дзясятага ці з шостага?

Мая зямлячка, юная паэтка Ганна Казакевіч прынесла новыя вершы. Цяпер дзяўчыне 22 гады, а некалі першыя пробы пяра яе, яшчэ школьніцы, я прадставіў у будакашалёўскай раённай газеце «Авангард», у часопісе «Качели». Чытаючы новыя творы Ганны, згадаў: «Гэта ж мы пазнаёміліся, калі ты была ў дзясятым класе». — «А я з вамі знаёмая з шостага», — удакладніла Ганна. — «Як гэта?» — не зразумеў я. — «Якраз тады вы прыходзілі да нас у школу. Паслухала вас — і саму пацягнула на вершы. З таго часу і пішу», — патлумачыла Ганна.

Як добра было б, каб кожная мая (і не толькі мая) сустрэча з чытачамі натхняла некага на паэзію! Калі не пісаць вершы, то хоць бы чытаць іх…

Хто болей беларуска?

Знаёмая бібліятэкарка запрасіла ў санаторый «Сасновы бор» пад Радашковічамі, дзе сама працуе, выступіць перад адпачывальнікамі.

Сказаў толькі некалькі слоў, як з месца чую голас жанчыны:

— Вы ўвесь час будзеце гаварыць па-беларуску?

— Вядома, я ж беларус і пішу на беларускай мове.

— Тады можна я пайду?

— Калі ласка, я ж ведаю, што тут адпачывае шмат расіян, і, магчыма, не ўсе разумеюць нашу мову.

— Я не расіянка, я з Баранавічаў, — як бы пакрыўджана заявіла жанчына, пакідаючы залу.

— А я вось расіянка. З-пад Мурманска, — прызналася наўздагон другая. — І мне вельмі прыемна слухаць, як гучыць беларуская мова.

І радасна, і горка адначасова.

Я лібрэтыст?

Музычны тэатр паставіў два спектаклі па маіх лібрэта: «Жыццё і смерць Янкі Купалы» і «Камедыю».

Дырэктар тэатра Аляксандр Пятровіч, з якім мы былі знаёмыя яшчэ падчас майго рэдактарства ў мінскай гарадской газеце «Добры вечар» (а ён тады ўзначальваў аддзел культуры ў Мінгарвыканкаме), неаднаразова прапаноўваў мне напісаць нешта для тэатра.

— Але ж я не драматург, — адмаўляўся я кожны раз. — Праўда, напісаў адну невялікую п'есу «Як Гаўка ў космас збіраўся». Яе нават паставілі дзіцячыя тэатры ў Чэрвені і Любані — гэта што вядома, бо быў запрошаны на прэм'еры. Ды і калі шчыра, то з усіх сталічных тэатраў я не хаджу толькі ў два: у оперны і ў ваш.

— Не ведаю, як у оперны, а ў наш пахадзі, — сказаў Пятровіч і выпісаў мне запрашальны білет на дзве асобы на ўвесь сезон.

На халяву, як кажуць, пахадзіў. Нават прасякнуўся тэатральнай атмасферай. Аднак за п'есу так і не ўзяўся.

А неяк дырэктар даў мне п'есу Анатоля Дзялендзіка пра каханне Янкі Купалы і Паўліны Мядзёлкі.

— Гэта драматургічны матэрыял. А ты перарабі яго ў лібрэта. Як разумееш, каб там было яшчэ з дзясятак песенных тэкстаў.

Я падумаў і пагадзіўся: маўляў, усе тэксты гэтыя можна падабраць у вершах Янкі Купалы.

А пачаў працаваць і раптам адчуў, што пад пэўныя сцэны не знаходжу такіх вершаў. І напісаў свае.

Цікава атрымалася: у спектаклі Янка Купала спявае песні на мае вершы.

Ці ёсць сэрца ў паэта?

«Поспех — гэта паспець», — сфармулявала Марына Цвятаева, паэтэса, а не менеджар ці бізнесмен. Крытэрыі здзейсненасці ва ўсіх розныя. Таццяна Барысюк на сення аўтар больш чым 120 літаратуразнаўчых і літаратурна-крытычных прац, акрамя таго, самарэалізоўваецца ў паэзіі, прозе і перакладах. «Дасягнуць дасканаласці дапаможа дысцыпліна думкі», — так фармулюе свой сакрэт поспеху ў вершы-таўтаграме гэты аўтар. Нядаўна Таццяна адзначыла юбілей, і гэта дае нагоду падвесці пэўныя вынікі ў яе творчасці.

Фота з асабістага архіва Таццяны Барысюк.

— Таццяна Пятроўна, вас ведаюць як паэта і літаратуразнаўца. У якіх сферах літаратуры яшчэ працуеце?

— Галоўныя мае дасягненні ў паэзіі — кніга вершаў «Аўтапартрэт» (2002), пасля якой было шмат паэтычных публікацый. Ужо час выдаваць чарговую кнігу. Я вынайшла новую цвёрдую форму верша — «залатое сячэнне». У сферы літаратуразнаўства выйшла пяць маіх буйных кампаратывістычных прац: «Сон у беларускай і польскай паэзіі 80—90-х гадоў XX стагоддзя», «Традыцыі англійскага і польскага рамантызму ў сучаснай беларускай паэзіі», «Пошукі бессмяротнасці ў сучаснай беларускай і рускай паэзіі», «Нацыянальныя вобразы свету і чалавека ў сучаснай беларускай і рускай паэзіі», «Канцэпты “сваё” і “чужое” ў сучаснай беларускай і брытанскай англамоўнай паэзіі» — так, маю больш за 120 літаратуразнаўчых і літаратурна-крытычных артыкулаў. Працую над дысертацыяй «Ідэйна-жанравыя пошукі ў сучаснай беларускай паэзіі». Выступаю таксама як крытык: пішу артыкулы, рэцэнзіі, творчыя партрэты. Перакладаю з англійскай, польскай, рускай, беларускай і ўкраінскай рускамоўнай паэзіі. Ёсць у мяне і празаічныя творы. Мая казка «Дванаццаць подзвігаў пацучыхі Дусі» надрукавана ў зборніку аўтарскіх казак «Нявеста для Базыля». Ёсць таксама аповесць-інтэрв’ю (новы сінтэтычны жанр!) «Каханне да двайніка, альбо Амаль галівудскія гісторыі», надрукаваная ў альманаху «Літаратурны экватар» за 2020 год.

— Якой бачыце сучасную паэзію?

— Яна вельмі разнастайная ў жанравa-тэматычным плане. Па-першае, аўтары раскрываюць усе магчымыя варыяцыі тэм у грамадзянскай, філасофскай, пейзажнай і інтымнай лірыцы. Па-другое, яны самаздзяйсняюцца ў розных цвёрдых формах (санеты, трыялеты, рандо, хайку, танка) і відах (раманс, элегія, эпіграма, пародыя) верша. Па-трэцяе, у сучаснай паэзіі асэнсоўваецца рэлігійная тэматыка, міфалагічныя і архетыпічныя вобразы. Заўважаецца тэндэнцыя да мінімізацыі форм, бо цяпер час імклівы і доўгія творы няма калі чытаць.

— Якія тэмы лічыце найбольш актуальнымі цяпер?

— Бачу ўсплёск цікавасці да радаводнай тэматыкі, не толькі ў справе стварэння генеалагічных схем, але і непасрэдна ў паэзіі. Вершы такога кшталту сустракаюцца ў Максіма Танка, Ніла Гілевіча, Анатоля Зэкава, Міколы Маляўкі, Мар’яна Дуксы, Сяргея Панізьніка і іншых. Паслядоўна гэтая тэматыка прапісалася ў баладах Віктара Шніпа, прысвечаных яго сваякам, з указаннем гадоў іх жыцця пад назвамі твораў. Таксама лічу, што наяўнасць містычных вобразаў і сюжэтаў здзіўляе літаратурную прастору і абуджае цікавасць да чытання мастацкіх твораў. Такія вобразы ёсць у паэзіі Алега Мінкіна, Людмілы Рублеўскай, Янкі Лайкова. Пісала навуковыя працы пра сон і бессмяротнасць у сучаснай беларускай паэзіі, параўноўвала мастацкія сны са снамі ў сучаснай польскай, а неўміручасць — з неўміручасцю ў сучаснай рускай паэзіі. Гэта таксама надзвычай цікава. Таямнічы свет здзіўляў і натхняў многіх, дапамагаў здзяйсняць навуковыя і творчыя адкрыцці, а памяць, само сабой зразумела, нікому не хочацца…

— Якія вершы пішаце зараз?

— 16 лютага 2021 года ў музеі Якуба Коласа мне ўручылі грамату за перамогу ў конкурсе «Песня сэрца» на найлепшыя творы інтымнай лірыкі. Гэта была ўзнагарода за маю нізку вершаў «Платанічнае каханне». Лічу, што менавіта па інтымнай лірыцы можна вызначыць, ці ёсць сэрца ў паэта, ці здольны ён на шчырасць, самаадданыя каханне і вернасць. Таму што, назіраючы за жыццём і творчасцю многіх калег па пяры, заўважыла, што на гэта здатны далёка не ўсе… Дарэчы, першую сваю ўзнагароду за мой «Трайны санет пра вечнае каханне» таксама атрымала ў тым самым музеі ў 2011 годзе, дзесяць гадоў таму!

— Каго з паэтаў лічыце настаўнікам?

— У першую чаргу Аляксандра Пушкіна, бо, натхнёная яго творамі ў пачатковых класах, напярэдадні свайго дня нараджэння (9 гадоў), пачала пісаць вершы, яшчэ нават не ведаючы, што мой бацька Пётр Барысюк, — паэт, але піша «ў стол». Ён мог хіба што на святочным сяброўскім застоллі жартам зарыфмаваць некалькі радкоў. Актыўна друкавацца пачаў пасля маіх першых публікацый, з 1993-га года. Пры жыцці паспеў выдаць дзве кнігі вершаў. Яшчэ са школьных гадоў я палюбіла паэзію Максіма Багдановіча. Яна ж па мелодыцы, па светаадчуванні блізкая да пушкінскай, таму, відаць, і знайшла водгук у маёй душы. Калі паступала вучыцца ў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пісала ўступнае сачыненне на вольную тэму «Мой любімы паэт» — пра Максіма Танка, бо найбольш вершаў на памяць ведала менавіта з яго творчасці. І містычным супадзеннем можна назваць той факт, што падчас вучобы ў аспірантуры Інстытута літаратуры НАН Беларусі на канферэнцыях я пазнаёмілася спачатку з двума «танкістамі» — Анатолем Вераб'ём і Міколам Мікулічам, а пасля пры паступленні ў гэты інстытут на работу мне даручылі рыхтаваць да друку два тамы Максіма Танка з яго 13-томнага Збору твораў і пісаць каментарыі да іх! Так я і сама стала «танкісткай»!

— Што можаце параіць паэтам, якія толькі пачынаюць творчы шлях?

— Раю слухаць сябе, свае думкі, сэрца і толькі пасля вучыцца ў іншых мастакоў слова. Пажадана сфарміраваць творчую індывідуальнасць, якая выразна б вылучалася на фоне іншых літаратараў. Найбольш аптымальным лічу такі шлях: спачатку — апора на сябе, на адметны ўнутраны свет, светаўспрыманне і густ, пасля варта адабраць для сябе пісьменнікаў, якія падабаюцца, знайсці ў іх адметныя рысы і вучыцца іх творчай індывідуальнасці! Напрыклад, у Яна Баршчэўскага можна павучыцца містыцызму, у Аляксандра Пушкіна — яго вялікаму родаваму ахопу (эпас, лірыка і драма), шматтэмнасці, высоканатхнёнай лірыцы кахання, адметнасці біяграфічнай легенды, у Валерыя Брусава — маштабнасці, манументальнасці яго творчых праектаў, напрыклад, «Сны чалавецтва» (лірычныя адлюстраванні ўсіх краін і ўсіх часоў), якія ён здзяйсняў на працягу 1911—1917 гадоў.

Гутарылі Соф’я ЦУХЛО і Дзіяна СЛАБАДЗЯНЮК

Гісторыя, напісаная на руінах

Вынікі даследавання на сумежжы гістарычнага краязнаўства, літаратуразнаўства, мастацтвазнаўства прафесара Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Янкі Купалы (ГрДУ) Валерыя Чарапіцы ўвасобіліся ў кнізе «Там, дзе Нёман нясе свае воды: Гродзеншчына ў жыцці і творчасці пісьменнікаў і дзеячаў мастацтваў Расіі (другая палова XIX — пачатак XXI стагоддзя)» (Гродна, ГрГУ, 2020).

Найбольш поўна ў выданні прадстаўлены майстры слова: Уладзімір Караленка, Уладзімір Маякоўскі, Юрый Алеша, Валянцін Катаеў, Аляксандр Твардоўскі. Першы раздзел цалкам прысвечаны сувязям рускай літаратуры з Гродзеншчынай. Другі мае назву «Гродзеншчына ў жыцці і творчасці дзеячаў мастацтва Расіі». Абодва ўтвараюць асноўную частку кнігі, што дапоўнена ўводзінамі, бібліяграфічным спісам і дадаткамі.

Шмат цікавай інфармацыі пададзена пра самых яскравых паэтаў міжваеннага Гродна — Сяргея Белабалоцкага і Хрысанфа Казлоўскага. Яны працавалі ва ўмовах, калі кіраўніцтва Польскай Рэспублікі трымала курс на паланізацыю нятытульных этнасаў. С. Белабалоцкі пражыў усяго 26 гадоў. Яго літаратурная спадчына ўвайшла ў кнігу «Пурпурныя акорды. Вершы», якая ўбачыла свет за год да смерці паэта, у 1930-м. Прафесар акрэсліў шчырае імкненне аўтара «Вершаў» раскрыць усю каляровую палітру свайго мастацкага бачання свету, падмацаваную індывідуальнай музычнасцю рытму верша і шырынёй творчага дыяпазону.

У манаграфіі ўпершыню асвятляецца дзейнасць Хрысанфа Казлоўскага ў якасці старшыні Гуртка аўтараў пры Саюзе рускіх студэнтаў Віленскага ўніверсітэта Стэфана Баторыя, яго ўдзел у Віленскай садружнасці паэтаў. В. Чарапіца даводзіць, што Х. Казлоўскі карыстаўся вялікім аўтарытэтам, нярэдка выступаў генератарам ідэй. Менавіта ён ініцыяваў ідэю зборніка вершаў удзельнікаў суполкі. «Адзіны» — зборнік Віленскай садружнасці паэтаў (Вільня, 1937 г.) стаў выніковым. У яго ўвайшлі 32 вершы васьмі паэтаў, дамінанту творчасці якіх складалі любоўная і пейзажная лірыка, роздум пра хуткаплыннасць быцця, супярэчлівасць чалавечай натуры, нацыянальна-патрыятычныя і рэлігійныя матывы.

Для пісьменніка Валянціна Катаева дзве сусветныя вайны пачыналіся на Гарадзеншчыне. Першая для яго ваенная кампанія — удзел у баях Рускай імператарскай арміі супраць войскаў Цэнтральных дзяржаў. На календары быў 1915 год. Усё пачалося пад Смаргонню. Вядома, што пад гэтым горадам 810 дзён вяліся найцяжэйшыя баі, што лік ахвяр ішоў на сотні тысяч. Зусім яшчэ малады Катаеў служыў у батарэі, размешчанай на ўскраіне Смаргоні. Тут здзейсніў подзвіг, за які атрымаў ордэн Святой Ганны IV ступені, які даваў права на асабістае дваранства. Шматлікія лісты В. Катаева з-пад Смаргоні сведчаць аб наяўнасці моцнага ўнутранага стрыжня, невычэрпным жаданні тварыць ва ўмовах, якія, здавалася б, ніяк на гэта не натхняюць. Нягледзячы на ўсе нягоды ваеннага побыту, абстрэлы і газавыя атакі, Валянцін Катаеў, рамантык па натуры, усялякую вольную хвіліну прысвячаў літаратурнай творчасці, акцэнтуе ўвагу даследчык і прыводзіць вершаваныя радкі, напісаныя Катаевым пад Смаргонню:

Мечтаю. Думаю. Брожу среди развалин
Разбитого снарядами села.
Повторены зеркалами проталин
Остатки хижин, выжженных дотла.

Верасень 1939 г. быў адзначаны для В. Катаева ўдзелам у вызваленчым паходзе Чырвонай арміі ў Заходнюю Беларусь. Пісьменнік апынуўся ў гушчы падзей у якасці ваеннага карэспандэнта газеты «Правда». Ён зноў пабываў на Гарадзеншчыне, у тых мясцінах, дзе ваяваў у Першую сусветную. Адчуваў асаблівае трымценне пры наведванні Смаргоні. Уражаннямі пра ўбачанае і пачутае ваенны карэспандэнт падзяліўся з чытачамі ў шэрагу сваіх публікацый на старонках перыёдыкі пад агульнай назвай «Па Заходняй Беларусі. Дарожныя нататкі», адзначыў аўтар даследавання.

Звязаны з Гроднам і некалькі старонак біяграфіі Аляксандра Твардоўскага. У 1939—1940 гадах у складзе групы пісьменнікаў Твардоўскі працаваў у газеце Ленінградскай ваеннай акругі. У якасці ваеннага карэспандэнта пабываў у Гродне. Другі раз пісьменнік наведаў горад 18 ліпеня 1944 года, што адлюстравана ў адным з нарысаў літаратара.

Вядома аб апублікаванні смелых рэчаў у часопісе «Новый мир» у той час, калі гэтае перыядычнае выданне ўзначальваў Твардоўскі. «Імя Васіля Быкава ўпершыню з’явілася на старонках “Нового мира” ў 1962 годзе ў артыкуле намесніка галоўнага рэдактара А. І. Кандратовіча, які, аналізуючы аповесць беларускага пісьменніка “Трэцяя ракета”, адзначыў “уменне апошняга схапіць галоўнае ў характары чалавека, не паступаючыся індывідуальнымі адценнямі”. Прачытаўшы гэты артыкул, Твардоўскі зрабіў выснову: “Трэба б гэтым Быкавым зацікавіцца як аўтарам”», — піша Валерый Чарапіца.

Знаёмства двух пісьменнікаў адбылося ў 1965 годзе, калі яны ўдзельнічалі ў кангрэсе пісьменнікаў, што праходзіў у Рыме. Менавіта тут галоўны рэдактар «Нового мира» паабяцаў Быкаву, што хоць ён яшчэ не чытаў яго новай аповесці «Мёртвым не баліць», тым не менш надрукуе яе... Сваё абяцанне Твардоўскі стрымаў — больш за тое, на працягу шасці гадоў іх супрацоўніцтва Васіль Быкаў апублікаваў у гэтым часопісе тры свае аповесці («Мёртвым не баліць», «Атака адразу» і «Круглянскі мост»), што дазволіла правінцыйнаму літаратару аўтарытэтна заявіць аб сабе.

Не абышоў увагай аўтар даследавання і акцёра Уладзіміра Высоцкага. Як аказалася, менавіта з Гродзеншчыны карані роду Высоцкіх. Тут нарадзіўся дзядуля Уладзіміра Сямёнавіча па бацькоўскай лініі Вольф Шлёмавіч Высоцкі. Прыводзяцца факты, звязаныя з удзелам ці прысутнасцю Уладзіміра Высоцкага і яго жонкі Марыны Уладзі ў 1969—1970 гадах на здымках фільмаў «Я родам з дзяцінства» і «Сыны ідуць у бой», якія адбываліся на Гарадзеншчыне... Наведалі акцёры і месца студэнцкіх археалагічных раскопак у Наваградку, якімі кіраваў Міхаіл Ткачоў.

Ёсць у выданні і старонкі, прысвечаныя дзядзьку паэта Аляксандра Блока. Кожны аматар прыгожага пісьменства адкрые для сябе шмат новага і адметнага.

Міхаіл СТРАЛЕЦ

Прыцягненне для нацыянальнай дыяспары

У Брэсцкай абласной бібліятэцы імя Максіма Горкага сабрана вялікая калекцыя кніг татарскіх пісьменнікаў, выдадзеных у Расіі і Беларусі за апошнія 70 гадоў.

Гісторыя абласной бібліятэкі, якая працуе ў горадзе над Бугам, на самай ускраіне Беларусі, налічвае восем дзесяцігоддзяў. Фонд гэтай захавальніцы ведаў набліжаецца да мільёна адзінак захоўвання. У бібліятэцы ёсць кнігі, чый век адлічвае некалькі стагоддзяў. І сярод дзясяткаў, соцень тысяч выданняў маюцца экзэмпляры, якія характарызуюць развіццё татарскай літаратуры на розных этапах яе станаўлення.

Дасведчаны брэсцкі бібліёграф Валянціна Гарбачэўская тлумачыць:

— Сёння ў нашай «татарскай калекцыі» — так умоўна назавём дадзены збор — 134 кнігі. Можа быць, не так і шмат. Але гэтыя выданні дазваляюць сфарміраваць, як мне здаецца, цэласнае ўяўленне аб татарскай нацыянальнай літаратуры. Ёсць шмат кніг крымскататарскіх аўтараў.

Самая ранняя кніга па часе выдання адносіцца да 1957 года. Гаворка пра зборнік «Выбраныя вершы і паэмы» Фаціха Карыма, што выйшаў у Казані ў Таткнігавыдаце пад рэдакцыяй Сямёна Ліпкіна. Фаціх Карым (1909—1945), які загінуў 19 лютага 1945 года на подступах да Кёнігсберга, — адзін з самых яркіх прадстаўнікоў татарскай літаратуры 1930-х гадоў. Свой першы зборнік вершаў «Ранняя песня» паэт выдаў у 1931 годзе. Індустрыялізацыю і калектывізацыю адлюстраваў у творах «Сёмы смутак» (1932) і «Шумны світанак» (1933), якія пабачылі свет, што называецца, па гарачых слядах. У час Вялікай Айчыннай вайны выпусціў зборнікі паэзіі «Каханне і нянавісць» (1943) і «Мелодыя і сіла» (1944), аповесць «Запіскі разведчыка» (1944).

Фаціх Карым.

У 1954 годзе выйшлі «Творы» Ф. Карыма ў трох тамах. Дарэчы, у пасляваенны час вершы і проза выдатнага татарскага пісьменніка перавыдаваліся неаднойчы. І на татарскай, і на рускай мовах. Адна з апошніх кніг — «Выбраныя творы» (Казань, Татарскае кніжнае выдавецтва, 2015). У франтавым лёсе татарскага пісьменніка і камандзіра ўзвода сапёраў 226-га асобнага сапёрнага батальёна 144-й стралковай дывізіі прасочваецца і беларускі след. Дывізія, у якой служыў, ваяваў Фаціх Карым, удзельнічала ў Смаленскай наступальнай аперацыі ў 1943 годзе і паклала пачатак вызваленню Беларусі. Затым 144-я дывізія — у Беларускай наступальнай аперацыі... Баявыя ўзнагароды Фаціха Карыма — ордэн Чырвонай Зоркі, ордэн Айчыннай вайны I ступені, баявыя медалі.

Верагодна, у спадчыне татарскага паэта ёсць і творы з франтавым «беларускім адрасам». Але гэта ўжо асобная тэма, якую, вядома ж, варта не адкладваць на заўтра ў кантэксце вывучэння беларуска-татарскіх літаратурных, культурных, гістарычных сувязей.

У Брэсцкай абласной бібліятэцы імя М. Горкага — дзевяць кніг Мусы Джаліля: выданні па часе выпуску — ад 1966 да 1990 года. Ёсць адно казанскае выданне — «Вершы» (Татарскае кніжнае

Муса Джаліль.

выдавецтва, 1975). Няма, на жаль, беларускіх зборнікаў Мусы Джаліля. Дакладней, ёсць выдадзеная ў Мінску ў 1979 г. на рускай мове кніга «Выбранае» з прадмовай Сібгата Хакіма, ён жа і склаў вялікі зборнік амаль у 240 старонак. Кніга выйшла ў мінскім выдавецтве «Вышэйшая школа», якое і цяпер уваходзіць у склад Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Але вось кніг Мусы Джаліля, перакладзеных менавіта на беларускую мову, у Брэсцкай абласной няма. А іх, між іншым, выйшла ў Мінску дзве — «Маабіцкі сшытак» (1975) і «Я гляджу на зоркі» (1985). Вядома, што перакладчыкамі паэзіі Мусы Джаліля на беларускую мову ў розныя гады былі Эдзі Агняцвет, Мікола Аўрамчык, Сцяпан Гаўрусёў, Аляксей Пысін.

Калі казаць пра выданні савецкага часу, то ў Брэсце захоўваюцца раманы, аповесці, зборнікі апавяданняў, паэтычных твораў А. Абсалямава «Вечны чалавек», «Агонь непагасны», М. Аміра «Чыстая душа», Ф. Амірхана «Выбранае», «Хаят», Э. Аміта «Алыніная крыніца», «Апошні шанц», Г. Ахунава «Дачка Волгі», «Чалавек шукае скарб», «Ядро арэха», Г. Башырава «Сем крыніц», «Гонар», А. Баянава «Другой зямлі няма», «Аповесць Горнага боку», Ш. Бікчурына «Глыбокі пласт», «Цвёрдая парода», Д. Валеева «Дыялогі», «Па вечным коле», Р. Валеева «Добрыя вочы суседа», «Жыць хочацца», «Лета ціхага горада», «Зямля гарадоў», І. Газі «Калі мацнеюць крылы», М. Галіева «Белая папараць», А. Гафара «Глыток вады», «Абавязак», «Зерне і жорны», А. Гілязава «У пятніцу, вечарам ...», «Веснавыя караваны», Э. Касімава «На Каме-рацэ», «Чулман — рака ўнукаў», Р. Куту «... І слёзы першыя любові», «Адна восень», «Недасланыя лісты», М. Малікава «Міласэрнасць», Ш. Мануравай «Муса» (раман прысвечаны Мусу Джалілю), З. Нуры «Дарога да сонца», «Азоранасць», «Пяюць закаханыя»...

Выданняў кніг татарскіх пісьменнікаў 1990-х — пачатку 2000-х гг. у Брэсце няма. Увогуле, гэта ўсё зразумела. Разбураны міждзяржаўныя сувязі, адпаведна страціліся кнігагандлёвыя сувязі, якія раней працавалі як адзіны агульнадзяржаўны механізм. Развалілася звыклая сістэма камплектавання бібліятэк. Ды і тыражы кніг сталі зусім іншыя. Але трэба аддаць належнае брэсцкім бібліятэкарам, іх уменню знаходзіць кантакты. Асобна вылучаецца падборка дзіцячых кніг татарскіх аўтараў. Гаворка пра кнігавыдавецтва «Ідэал-Прэс» у серыі «Сучасныя аўтары — дзецям». Сярод аўтараў — пісьменнікі, якія працуюць на рускай мове; пад адной вокладкай — арыгінальныя тэксты і іх пераклады на татарскую мову.

У Брэсце знаходзяцца і кнігі татарскіх паэтаў, празаікаў, выдадзеныя ў Мінску ў перакладзе на беларускую мову, у прыватнасці зборнік «Сярэбраны прамень» народнага паэта Татарстана Рэната Харыса. Кніга выйшла ў мінскім выдавецтве «Каўчэг» у перакладзе на беларускую Віктара Шніпа і Юрася Пацюпы. З прадмовай вядомага беларускага празаіка, публіцыста Сяргея Трахімёнка. Рэнат Харыс — сапраўдны сябар беларускай літаратуры. Ён не адзін раз бываў у Беларусі.

Захоўваецца ў бібліятэцы зборнік народнага паэта Беларусі Янкі Купалы «Санеты», дзе сярод арыгінальнага тэксту вядомага купалаўскага цыкла ёсць і пераклады на 16 моў: тут і «Санеты» на татарскай, пераўвасабленні Рэната Харыса. Іншыя пераклады — на армянскую, грузінскую, іспанскую, кітайскую, літоўскую, мангольскую, рускую, сербскую, славацкую, табасаранскую, украінскую, французскую, чачэнскую, чувашскую, шорскую мовы. Дарэчы, Рэнат Харыс выдаў у Казані зборнік беларускай паэзіі ў перакладах на татарскую і асобна выпусціў «Санеты» на татарскай, рускай і беларускай мовах. Будзем спадзявацца, што гэтыя кнігі яшчэ папоўняць калекцыю Брэсцкай абласной кніжніцы.

І, карыстаючыся выпадкам, не магу не падкрэсліць, што клопаты Рэната Харыса па прапагандзе ў Татарстане беларускай нацыянальнай літаратуры патрабуюць высокай дзяржаўнай адзнакі з боку Рэспублікі Беларусь.

Рэнат Харыс.

Ёсць у Брэсце і беларускія кнігі татарскіх пісьменнікаў Ш. Ракіпава «Адкуль ты, Жан?» (аповесць пра героя Вялікай Айчыннай вайны, мінскага падпольшчыка Івана Кабушкіна, лёс якога звязаны і з Татарстанам; пераклаў кнігу Уладзімір Мехаў); аповесць Г. Башырава «Зялёная мая калыска» (пераклад Алены Васілевіч; кніга выйшла ў мінскім выдавецтве «Юнацтва» ў 1981 годзе).

Сярод іншых беларускіх кніг татарскіх аўтараў — зборнік паэзіі Закі Нуры «Радасць сустрэч» на беларускай мове

Закі Нуры.

(Мінск, 1973). Закі Нуры (1921—1994) у гады Вялікай Айчыннай вайны партызаніў у Беларусі, быў начальнікам разведкі ў атрадзе легендарнага Канстанціна Заслонава. У 1944—1946 гадах — старшыня Аршанскага гарвыканкама. Пра сваё партызанскае юнацтва напісаў зборнік апавяданняў «І мёртвыя помсцілі».

У Мінску выдадзены і іншыя кнігі татарскіх аўтараў у перакладзе на беларускую мову, у прыватнасці два паэтычныя зборнікі народнага паэта Татарстана Роберта Мінуліна. Хацелася б і іх убачыць на паліцах Брэсцкай абласной бібліятэкі імя М. Горкага. Але ёсць у берасцейскім кнігазборы кнігі пісьменнікаў Татарстана і на татарскай мове: і Роберта Мінуліна, і Лэйлы Гімадзеевай...

Усяго ў свеце, калі верыць Вікіпедыі, пражывае 6 421 500 татар. Багаты, нацыянальна вызначаны народ, які ўмее захоўваць сваю гістарычную памяць. Татараў на працягу многіх стагоддзяў добра ведаюць у беларускіх мястэчках. Яны — у старажытным Навагрудку, у Іўі, Смілавічах, Пухавічах, Уздзе, іншых паселішчах. У Беларусі ўсяго пражывае болей за сем тысяч татараў. У суседніх з Беларуссю краінах, для параўнання, у Літве — 2793, Латвіі — 2339, ва Украіне — 73 304 чалавек. Не параўнаць з Казахстанам, дзе татар — больш за 200 000 чалавек. І ўсё ж, і ўсё ж... Па-першае, калекцыі, падобныя брэсцкай, інфармацыя аб татарскіх кнігах, калі выданні прадстаўлены ў розных частках фондаў Брэсцкай ці іншай бібліятэкі, з'яўляюцца свайго роду прыцягненнем для нацыянальнай дыяспары, спрыяюць выбудоўванню і такой кніжнай пляцоўкі аб'яднальнага характару. Па-другое, «татарскія» зборы кніг, а, магчыма, і перыядычных матэрыялаў, іншых дакументальных, друкаваных (і не толькі друкаваных) крыніц дазваляюць развіваць цікавасць да нацыянальнай літаратуры, нацыянальнай культуры ў карэнных жыхароў краіны, Брэста ў дадзеным выпадку.

Мікола БЕРЛЕЖ

Лірычныя абстракцыі жыцця і надзеі

Як адгалосак цёплай восені, што саступае месца холаду, зімовай скаванасці і скупасці на сонечнае святло, — уражанне ад персанальнай выстаўкі жывапісу Міхаіла Ляўковіча пад назвай «Зваротная сувязь», якая нядаўна адкрылася ў сталічнай мастацкай галерэі-салоне «АртХаос». Цёплыя яркія адценні на фоне блакітнай палітры, што нагадвае бяздоннае, якое бывае толькі ўвосень, неба — касмічнае, неспасцігальнае, трансцэндэнтнае, вечнае…

І толькі потым праступаюць сілуэты і абрысы: лініі, сімвалы, фігуры, вазы, букеты кветак — у асноўным тых, што суправаджаюць згасанне прыроды перад надыходам змерзлай здранцвеласці, пранізлівых завірух, доўгага сну… Згадваецца пушкінскае: «Цветы последние милей // роскошных первенцев полей». Хочацца ўвабраць у сябе ўсю цеплыню запозненага развітання, каб у надыходзячым холадзе было чым адагравацца, хаця б ва ўспамінах…

Тэма кветак для мастака новая. Ранейшыя яго работы звязаны з пачуццёвымі і прыроднымі асацыяцыямі і ўспамінамі.

Большасць карцін, прадстаўленых на выстаўцы, выйшлі з-пад пэндзля М. Ляўковіча на працягу некалькіх апошніх месяцаў, таму сярод іх шмат выяў з восеньскімі кветкамі. Галоўнае на палотнах — пачуцці і адчуванні, атрыманыя праз зрокавае ўражанне.

— Прапусціўшы эмоцыі праз сябе, бачыш, якое месца ў абстрактнай кампазіцыі аддаць кветкам, — дзяліўся з прысутнымі сакрэтамі творчай кухні мастак. — Вось, напрыклад, работа пад назвай «Гарачае сонца». Яна навеяна летам, калі было немагчыма схавацца ад спякоты. Эмоцыі выбухнулі ў «гарачай» колеравай гаме… І — кветкі, але ўвага на іх не акцэнтуецца. Галоўнае агульнае ўражанне — усё дыхае гарачынёй. Работа дае магчымасць згадаць, як мы пакутавалі ад спёкі…

«Другі сон рыбы», 2019 г.

«Зоркі верасня», 2021 г.

На іншых палотнах Міхаіла Ляўковіча выяўлены больш абстрактныя вобразы, якія можна вывучаць бясконца, і чым больш ты спрабуеш ісці па пэўным лагічным ланцужку, адпраўляючыся з зыходнага пункта — пакінутай аўтарам падказкі ў выглядзе таго ці іншага сімвалу, тым больш з'яўляецца асацыяцый, што паўстаюць з уласнага шляху спазнання рэчаіснасці.

— Каноны, ці пэўныя межы, якія існуюць у мастацтве, заўжды хтосьці разбураў: з'яўляліся наватары, якія імкнуліся выйсці за вызначаныя традыцыяй межы, вынайсці нешта новае, разбураючы старое. З'явіліся такія паняцці, як геаметрычны і лірычны абстракцыянізм. Я сябе атаясамляю з лірычным, — распавядаў Міхаіл Ляўковіч падчас адкрыцця выстаўкі.

Тэхніка, у якой працуе мастак, — алей. Пошук новага тут датычыць хіба што пэўных дэталяў тэхнічнага плана. Галоўнае для творцы — адкрыць новае ў сабе і трансфармаваць зрокавыя ўражанні праз уласную свядомасць, не адрываючыся ад абстракцыі.

— Не ведаю, колькі часу яшчэ буду ў гэтым кірунку, бо мне падабаецца ў ім існаваць: з захапленнем іду ў майстэрню і выстрэльваю эмоцыяй, увасобленай у форме і адценні.

У гэтым плане характэрна карціна пад назвай «Другі сон рыбы». Твор гэты распавядальны, па стылістыцы вельмі адрозны ад астатніх. Так, рыба жыве сваім жыццём. Аўтар выкарыстоўвае геаметрычную абстракцыю і разам з тым падказвае гледачу дэталі: побач з рыбай — сеткі, але відаць, што яны прайшлі міма, і рыба — жыве, плыве. Таму і ў назве зафіксаваны не першы, а менавіта другі сон рыбы! А колькі гэтых сноў у яе яшчэ будзе, ніхто не ведае…

— Варта было трансфармавацца ў цела рыбы, каб адчуць яе скурай, чым яна жыве і што яна бачыць… Творцы валодаюць унікальнай магчымасцю вандраваць і ў часе, і ў прасторы, перакідваючы сябе ў вобразах, марах, летуценнях ці наперад, ці глыбока ў гісторыю, альбо нават пранікаюць у зямныя нетры, — перакананы мастак. — Гэта могуць тыя, у каго развіта абстрактнае мысленне. Такім чынам, і паспрабаваў пераўтварыцца ў рыбу: гэта ж цэлы сусвет! Падзей, адносін, ландшафтаў, — існаванне, якое віруе!

Адметная і работа пад назвай «Зімовае рэха». Яе таксама можна ўспрымаць як спробу вандроўкі. Калі знаходзішся ў лесе і паспрабуеш гукнуць, як рэха ўцякае ад цябе? Рухаецца па пэўнай траекторыі, а потым… вяртаецца! Яно нематэрыяльнае, але ж мы адчуваем яго прысутнасці вакол нас! У творы мастак пастараўся праз касмічную цемру паказаць прарывы жыцця і надзеі… Гукі перадаць выяўленчымі сродкамі надзвычай складана, але аўтар паспрабаваў раскласці рэха па дыяганалі, што імкнецца ўгору: спачатку гукі ідуць уверх, а потым вяртаюцца, пераўтвараючыся ў вялікую светлавую пляму, якая выбухае перад вачыма складанымі каларыстычнымі напластаваннямі і ўрэшце згасае…

А вось сюжэт работы «Яблыкі дзяцінства», па словах мастака, падказалі самі дрэвы. Кіруючыся рэалістычным падыходам, аўтар перадае дзіцячыя пачуцці, народжаныя свавольствамі: калі надзвычай прывабным падавалася залезці ў чужы сад, дзе яблыкі абавязкова самыя смачныя.

Карціна «Новае танга» нараджалася пад адпаведную музыку — аўтар імкнуўся злавіць рытміку музычных гукаў і перакласці яе на выяўленчую мову. На палатне шмат вертыкальных ліній, якія чаргуюцца з каляровымі абстракцыямі, рэзкімі кантрастамі. Гарызантальных штрыхоў амаль няма.

«Услед за зімовым рэхам», 2018 г.

Уражвае і работа «Водар зямлі», якая перадае настрой цёплай вясны праз асацыяцыі водару прэлага лісця і бляску свежай раллі. Мастак пакідае намёк для гледача: ралля — цёмная і тлустая, цяпло — адтуль…

Таша ШПАКОЎСКАЯ, фота аўтара

Цудоўная сямёрка ў Барысаве

***«KRAJ»* — выстаўка жывапісу пад такой кароткай, але ёмістай назвай адкрылася 14 кастрычніка ў мастацкай галерэі «З'ява» Барысаўскай цэнтральнай раённай бібліятэкі імя І. Х. Каладзеева. Падзея прымеркавана да рэспубліканскай акцыі «Барысаў — культурная сталіца Беларусі 2021 года».**

Дазвольце спачатку азірнуцца назад і сказаць пра апошні знак любові да роднага горада ўраджэнца Барысава, знакамітага мастака-жывапісца Валерыя Шкарубы. Калі б год таму ён не дапамог супрацоўнікам аддзела галерэйна-выставачнай дзейнасці цэнтральнай бібліятэкі, зрабіўшы важны тэлефонны званок выкладчыку факультэта жывапісу Беларускай акадэміі мастацтваў мастаку Антону Вырву, выстаўкі «*KRAJ*» сёння не адбылося б. Высокае прафесійнае мастацтва — экспазіцыя з больш як 50 работ — даніна павагі і памяці Валерыю Фёдаравічу.

Светлай прасторы галерэі «З'ява» для выдатных твораў аказалася мала. Работы размясціліся і на сценах суседняй галерэі «ARTквартал».

— Групу з сямі мастакоў, якія ярка заявілі пра сябе, узначальвае Антон Вырва. Ён прапаноўваў для экспазіцыі 6 карцін. У гэтай плеядзе — паважаныя і вядомыя беларускія мастакі Васіль Пяшкун, Віталь Гуназа, Міхась Крот, Павел Хадаровіч, Раман Коршунаў, Уладзь Пятручык, — адзначыла на адкрыцці выстаўкі загадчык аддзела галерэйна-выставачнай дзейнасці Таццяна Кірылава. — Мастакі прыехалі ў Барысаў за некалькі дзён да адкрыцця праекта — з мэтай стварыць мастацкую серыю аб нашым горадзе. Папрацавалі плённа! Пры гэтым два пейзажы, што называецца, «з колаў» трапілі на цяперашнюю выстаўку — «Восеньскі дворык у Барысаве» Міхася Крата і «Восень у старым горадзе» Васіля Пешкуна. Да прэзентабельных ілюстрацый старой часткі нашага горада Васіль Пяшкун дадаў твор 2017 года «Ціхі дворык».

Калі казаць пра геаграфію работ, дэманструюцца розныя куткі Беларусі: Магілёўшчына, Гомельшчына, Міншчына... Прырода, як аднойчы сказаў Валерый Шкаруба, — невычэрпная крыніца натхнення. А значыць, кожная новая карціна — новы глыток паветра ў жанры класічнага рэалізму. Таму, напэўна, невыпадкова многія музеі і галерэі краіны стаяць у чарзе па работы цудоўнай сямёркі, сабраныя ў экспазіцыі «*KRAJ*». Майстэрства, глыбіня спасціжэння сутнасці беларускай прыроды, выдатны каларыт, дзівосны ўнутраны змест карцін блізкія і зразумелыя гледачу любога ўзросту.

На адкрыцці экспазіцыі майстар пленэру барысаўчанін Пётр Казявін зазначыў:

— Барысаву пашанцавала любавацца такім магутным жывапісам. Прыгажосць прыроды перададзена незвычайна, аўтары з ёй зліваюцца ў адно цэлае.

Культуролаг Галіна Глебава дадала, што кожны чалавек убачыць у гэтых творах нешта сваё, роднае, а ўвасабляецца яно ў звычайным і простым паняцці «Беларусь». Тут бачыцца вялікая любоў да роднага краю.

— Уменне шчыра паказваць прыгажосць свету вартае павагі. Слова «мастак» для гэтых майстроў не прафесія, а жыццё і лёс, — перакананы творца Уладзімір Сайко.

Пранікнёныя, глыбокія і запамінальныя вобразы роднай Беларусі тонка перадаюць дзіўнае майстэрства ўдзельнікаў экспазіцыі «*KRAJ*». Дарэчы, творчы лёс дваіх звязаны з Барысаўшчынай. Антон Вырва вучыўся ў Фёдара Кісялёва, роднага брата барысаўскага мастака Мікалая Кісялёва. А юны Уладзь Пятручык, які калісьці прыязджаў у вёску Чарневічы, браў урокі ў Мікалая Ісаёнка. Музыка пейзажу, увасабленне на палотнах рэальна існуючых месцаў упрыгожваюць культурную сталіцу Беларусі сёння. Заўтра яны абавязкова стануць упрыгажэннем любой іншай выстаўкі.

Алена БРЫЦКАЯ

Сузіранне, адчуванне, натхненне, спрычыненне...

Восень бывае розная: радасная, яркая, багатая на ўраджай, залатая. А бывае сумная, з ціхім плачам дробнага дажджу, туманамі, паніклай, апалай лістотай, халоднымі вятрамі, начнымі замаразкамі, першым снегам... І калі любуешся прыгажосцю прыроды — апаноўваюць розныя пачуцці. Таму, напэўна, гэтая пара года так натхняе пісьменнікаў, мастакоў і музыкантаў — прыцягвае разнастайнасцю яркіх фарбаў, хараством і непаўторнасцю, зменай настрояў. Менавіта залатой восенню мы ўсе крышачку Пушкіны, Левітаны і Чайкоўскія адначасова. Як выдатна, калі побач і ўнутры нас — чароўны свет мастацтва: паэзія, жывапіс, музыка... Незалежна ад надвор'я яркія эмоцыі і цеплыню восеньскага настрою яшчэ больш тонка адчуць запрашае гэтымі днямі Беларуская дзяржаўная філармонія.

Струны душы

«Чароўныя фарбы восені» — так і называецца адзін з канцэртаў, які заўтра, **30 кастрычніка**, на сцэне Вялікай залы прадставіць у новым аўтарскім праекце гітарыст Павел Кухта, выпускнік Беларускай дзяржаўнай акадэміі музыкі і магістратуры пры ёй, лаўрэат больш як 20 міжнародных конкурсаў, удзельнік шматлікіх міжнародных фестываляў у якасці спецыяльнага госця, члена журы і выкладчыка майстар-класаў. Павел прэзентуе гучанне гітары — як сольнага інструмента, так і ў ансамблі. З гітарай прагучаць струнныя інструменты, бо менавіта іх гукі, на яго думку, перадаюць тую адметную ўтульную цеплыню, якая гарманіруе з кастрычніцкімі фарбамі. Гукавую прастору расфарбуюць спеўныя смычковыя ў выкананні Мінскага струннага квартэта ў складзе скрыпачак Кацярыны Мішчанчук, Алесі Тарасенкі, альтысткі Алены Прановіч і віяланчэлісткі Кацярыны Акавіцкай, кантрабасіста Данііла Радзівонава і клавесіністкі Марыны Рамейкі. У першым аддзяленні прагучаць сольныя творы іспанскіх кампазітараў, а таксама сапраўдны эксклюзіў — сусветная прэм'ера Санаты ў 4-х частках для гітары і клавесіна вядомага расійскага кампазітара Мікіты Кошкіна. Саната была напісана 10 гадоў назад, у 2011 годзе, але дачакалася выканання толькі цяпер, і менавіта беларуская публіка мае гонар першай пачуць гэты музычны твор. Другое аддзяленне цалкам прысвечана музыцы Астара П'яцолы — «караля танга», легендарнага стваральніка ўласнага стылю танга-нуэва.

Казачныя прыгоды

У дні школьных восеньскіх канікул не абмінае ўвагай філармонія і маленькіх слухачоў. **2 лістапада** запрашае іх разам з бацькамі ў малую залу імя Р. Шырмы на музычна-адукацыйную праграму для дзяцей і юнацтва «Усё можа музыка!». У выкананні салістаў-вакалістаў і салістаў-інструменталістаў прагучаць найлепшыя нумары з рэпертуарных музычных спектакляў, шэдэўры сусветнай класічнай музыкі і творы сучасных кампазітараў. Аўтар праграмы, вядучая і музыказнаўца Любоў Сыцько, у сваім выступленні закране самыя розныя тэмы: ад узнікнення і стварэння музычных інструментаў, разнастайнасці пеўчых галасоў да гісторыі нараджэння музычных твораў, што гучаць у праграме.

4 лістапада, таксама на сцэне малой залы, гледачоў чакае прэм'ера — музычны спектакль «Каралеўскі бутэрброд». У аснову сюжэта музычнай казкі для дзяцей была пакладзена «Балада пра каралеўскі бутэрброд» англійскага пісьменніка Алана Мілна. Музыку да спектакля напісаў вядомы пецярбургскі кампазітар — заслужаны дзеяч мастацтваў РСФСР Георгій Партноў.

«Пацешны сюжэт, яркія музычныя характарыстыкі персанажаў, арыгінальнае афармленне спектакля і, самае галоўнае, лёгкая для ўспрымання, блізкая моцартаўскай, музыка прыцягнуць маленькіх гледачоў і пацешаць дарослых», — абяцаюць аўтары мюзікла.

5 лістапада малая зала запрашае на спектакль «Хрустальны чаравічак» (па матывах казкі Шарля Перо «Папялушка»). Гэта жывы, яскравы спектакль з дынамічным сюжэтам і чароўнай музыкай. Кампазітар і аўтар лібрэта — Уладзімір Саўчык, рэжысёр-пастаноўшчык — Ігар Пятроў.

Выканаўцы роляў ва ўсіх згаданых спектаклях — легендарны калектыў Філармонія для дзяцей і юнацтва Белдзяржфілармоніі — лаўрэаты і дыпламанты міжнародных і нацыянальных конкурсаў. Летась калектыў адзначыў свой 60-гадовы юбілей.

Мы хочам танцаваць!

Ёсць у лістападаўскім рэпертуары філармоніі і харэаграфічныя праекты. Так, **2 лістапада** заслужаны калектыў Беларусі — Дзяржаўны акадэмічны ансамбль танца — запрашае ў вялікую канцэртную залу на «Танцавальнае падарожжа па краінах і кантынентах». Мастацкі кіраўнік калектыву — народны артыст Валянцін Дудкевіч.

Канцэрт пад назвай «Белы птах», прысвечаны жыццю і творчасці заслужанага артыста Беларусі Анатоля Кашталапава (1948—2018), яскравага танцора, мультыінструменталіста, аўтара песень, мастацкага кіраўніка ансамбля «Свята» (2002—2018), адбудзецца **3 лістапада** на сцэне вялікай залы філармоніі. Шырыня і шчырасць душы музыканта знайшлі сваё адлюстраванне ў яго музычных творах, песнях, аранжыроўках, якія выканаюць у канцэрце-прысвячэнні творчыя калектывы, дзе працаваў

Анатоль Міхайлавіч. Прагучаць прэм'еры песень, напісаных ім раней, але ў свой час не прэзентаваных публіцы, а таксама вершы Таццяны Маслоўскай, з якой выбітны музыкант стварыў большасць сваіх вакальных твораў.

У праграме «Белы птах» возьмуць удзел народная артыстка Беларусі Ядвіга Паплаўская, заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь Беларускі дзяржаўны ансамбль народнай музыкі «Свята», заслужаны харэаграфічны ансамбль «Харошкі», ансамбль «Гуляй, казак» і многія іншыя. Рэжысёр канцэрта — заслужаны дзеяч мастацтваў Ніна Восіпава, аўтар праекта — Алеся Кашталапава.

4 лістапада на сцэне вялікай залы — юбілейны канцэрт да 50-годдзя народнага ансамбля танца «Вязанка». У рэпертуары калектыву — танцы народаў свету і беларускія фальклорныя танцы, пастаўленыя яго нязменным мастацкім кіраўніком Леанідам Тушынскім. Калектыў налічвае каля 50 чалавек — гэта артысты балета асноўнага саставу, падрыхтоўчай групы і артысты аркестра. Акампаніруе ансамблю і выконвае сольныя музычныя творы аркестр народных інструментаў.

Усім вядомае і сімпатычнае

Папулярную музыку са знакамітых мюзіклаў, эстрады, аперэт кампазітараў І. Кальмана, Э. Лойда-Уэбера, Н. Бродскага, Р. Паўлса і іншых можна паслухаць **10 лістапада** на сцэне малой залы імя Р. Шырмы ў рамках праграмы «Парад дуэтаў "Падарожныя ў ночы"». Выканаўцы — лаўрэаты міжнародных конкурсаў Юлія Казіміровіч (мецца-сапрана), Віктар Кедала (тэнар), Дзмітрый Кулакоў (барытон), Ірына Апалінская (фартэпіяна). У канцэрце прымуць удзел студэнты рок-студыі «Школа зорак *Alexander Kiss*».

Самыя папулярныя французскія хіты ўсіх часоў — залатыя шлягеры Шарля Азнавура і Джо Дасена, Эдыт Піяф і Мірэй Мацье, Даліды і Лары Фабіян, на якіх выраслі не адно пакаленне слухачоў, — у выкананні галоўнага натхняльніка і дзеючай асобы Вольгі Калеснікавай разам з артыстамі Ігарам Задарожным, Мікітам Касцюкевічам і Аляксандрам Саванцом можна пачуць **12 лістапада** на сцэне вялікай залы філармоніі ў канцэртнай праграме «Французскі бульвар». Тэатральная дзея будзе суправаджацца маналогамі актрысы Алы Проліч.

Старая добрая класіка

Камерную музыку па творах класічных кампазітараў — Ё. Гайдна, В. А. Моцарта, Л. ван Бетховена, Ф. Шапэна, М. Равеэля, С. Рахманінава — будзе магчымасць пачуць **9 лістапада** ў малой зале на вечары фартэпіяннай музыкі «*Piano Passion*». Для вас сыграе лаўрэат міжнародных конкурсаў Алена Навуменка (фартэпіяна). У канцэрце таксама прыме ўдзел Ганна Брылёва.

А ў рамках цыкла «Класіка для ўсіх» 11 лістапада ў вялікай зале можна паслухаць Ф. Мендэльсона (сімфонія № 4 ля мажор «Італьянская», op. 90), І. Стравінскага (сюіта з балета «Пульчынела»), С. Рахманінава («Рапсодыя на тэму Паганіні» для фартэпіяна з аркестрам, op. 43). Дырыжор — Юрый Караваеў.

Стваральнікі ўпадабанага слухачамі фармату «Музыкатэрапія» **12 лістапада** на сцэне малой залы філармоніі прадстаўляюць цалкам новую праграму пад назвай «Славянская думка». Яна складаецца са славянскіх мелодый і вядомай класікі рускіх, беларускіх і польскіх кампазітараў: «Поры года» Чайкоўскага, «Раманс» Свірыдава, «Вакаліз» Рахманінава, чароўная «Купалінка», задуменны «Накцюрн» Шапэна і іншыя сусветна вядомыя творы ў спалучэнні з унікальнымі гукатэрапеўтычнымі інструментамі — рускімі званочкамі Нада і ніжагародскімі валдайскімі званочкамі, гукамі прыроды і сапраўднымі рускімі звонамі. Таксама ў праграме — медытатыўная музыка для цымбалаў... Выканаўцы: Арцём Шаплыка (фартэпіяна), Аляксей Ладзік (флейта) і інш.

Вось такую насычаную і разнастайную праграму прапануе філармонія ў першай палове лістапада. А будзе ж яшчэ і другая!.. Сачыце за афішамі!

Анонс падрыхтавала Кацярына МАЛЕЙ

Кес і птушка-скала

Сярод першаадкрывальнікаў неабсяжных прасторaў Поўначы і Сібіры ёсць і выхадцы з Вялікага Княства Літоўскага. Гэта, напрыклад, Елісей Буза, які асвойваў раку Лену. На жаль, гады яго нараджэння і смерці невядомы. Застаецца загадкай і тое, дзе нарадзіўся і дзе памёр. З яго біяграфіі «высвечваюцца» толькі шаснаццаць гадоў.

Упершыню згадваецца ў так званых акладных кнігах Енісейскага астрога пад 1630 годам. У іх заносіліся звесткі аб тых, хто там служыў. Елісей Юр'евіч тады быў радавым стральцом. Разам з іншымі да вясны 1633 года пакараў «новые землицы». Калі стаў дзясятнікам, енісейскі ваявода Пракоп Сакоўнін накіраваў яго з невялікім атрадам на Лену з двума заданнямі.

Першае тычылася «ахвотных людзей». Тыя, каго набіралі паводле загаду ваяводы, атрымлівалі гасударава жалаванне. Аднак некаторыя самі напрошваліся ў няблізкае, а ў нечым і небяспечнае падарожжа. Адным надакучвалі паўсядзённыя звады, сваркі, нелады. Іншых гняло аднастайнае жыццё. Запісваліся і звычайныя авантурысты, тыя, хто і дня не мог пражыць без прыгод.

Паводле другога задання, мусіў агледзець усе рэкі, якія ўпадаюць у Ледавітае мора. Для паразумення з туземцамі накупляў розных тавараў на дзве тысячы рублёў: нажы, алавяны посуд, шмат што іншае з паўсядзённага ўжытку. Узяў і некалькі ўпрыгожанняў.

Туземцы да няпрошаных гасцей паставіліся прыхільна. Якуты, якія дагэтуль былі ваяўнічымі, зразумелі, што з прышэльцамі лепш жыць у згодзе. Ясак заплацілі хутка і ахвотна. Абрадавала іх і тое, што не з пустымі рукамі з'явіліся. Свайго роду разменнай манетай стала, як і звычайна, «мяккае золата». Так называлі тут шкуркі собаля. Елісей Юр'евіч за прывезеныя тавары набыў і футра іншых звяроў — мядзведзяў, рысяў, аленяў…

Дабраўшыся да вусця Алёкмы, правага прытока Лены, атрад спыніўся, каб перачакаць зіму ў Алёкмінскім астрозе. Насельнікі радасна сустрэлі іх. Са сваімі даўно ўсё сказана-пераказана. А так цікава пачуць свежыя навіны. Сваім чалавекам Буза стаў для іх яшчэ і таму, што падзяліўся запасамі. Даў прадуктаў, крыху зброі, пораху. Без праблем знайшоў ахвотных папоўніць свой атрад. У ім было прыкладна чалавек дзесяць — больш у спешцы не знайшоў. А ў астрозе да іх далучылася яшчэ 40.

З нецярпеннем чакаў вясны. Не толькі таму, каб хутчэй даплысці да вусця Лены. Адзін казак паведаў, што на правым беразе ёсць цуд з цудаў. Спачатку сотні міль у маўклівым роздуме стаяць дрэвы. Сцяна іх доўжыцца і доўжыцца, губляючыся за гарызонтам. Падплываеш бліжэй — ранейшае відовішча. І так да бясконцасці. Толькі ў асобных месцах яна перарываецца, уступае месца кустоўю. Пасля зноў нібы вырастае з зямлі. Раптоўна, хутка, «паглынаючы» мілю за міляй...

Здаецца, ніколі не будзе ёй канца. Але нечакана на нейкае імгненне знікае. Доўгі час была і — няма. Раптам з'яўляецца іншая, ужо не такая суцэльная. Складаецца са скал розных канфігурацый. Яны таксама зоймуць не адзін дзясятак міль... Але не толькі гэтым цікавыя. Чым — субяседнік не сказаў.

Хацелася як мага хутчэй пра ўсё даведацца. Але казак толькі пагладжваў сваю смалістую бараду. Прыжмурваў, гэтаксама загадкава, вочы:

— Пра гэта, Елісей, расказаць немагчыма…

— Чаму? — здзівіўся Буза.

— Настолькі яно неверагоднае, што трэба самому ўбачыць, — усміхнуўся казак. Маўляў, ведаю такое, што ты і ўявіць не можаш.

Жаданне хутчэй пазнаёміцца з дзіўнымі скаламі таксама падштурхоўвала яго ў дарогу. Але нікому ў гэтым не прызнаўся. Баяўся, што, чаго добрага, засмяюць. Хіба да твару мужчыну, загартаванаму ў паходах, шукаць нейкую прыгажосць. А яму ж так хацелася чагосьці незвычайнага. Сям'ёй не абзавёўся. Сапраўднага сябра не знайшоў. А пабачыш гэта — на душы пасвятлее.

У прадчуванні сустрэчы з цудам, у якім ужо не сумняваўся, і пакінуў Алёкмінскі астрог. Адправіліся толькі тады, калі на Лене не засталося ніводнай льдзіны. Плылі хутка, бо, як вядома, ішлі па цячэнні. Ды ўсім падавалася, што нават хутчэй, чым па восені, калі дабіраліся да Алёкмінскага астрога. Быццам вада ў Лене, адпачыўшы пад шматметровай тоўшчай лёду, рухалася больш імкліва. Канечне, разумелі, што гэта не так. Зімой, як і ў іншыя поры года, яна не стаяла на месцы. Але калі ў нешта верыш… Хацелася верыць і Бузу.

— Што задумаўся, Юр'евіч? — казак вывеў яго з роздуму.

— Гляджу на дрэвы, што стаяць сцяной, і…

— …і чакаеш сустрэчы з дзіўнымі скаламі?

— Твая праўда.

— Яшчэ наглядзішся, — казак хітравата паглядзеў на яго.

Елісей Юр'евіч здагадаўся, што гэтая хітраватасць у позірку з'явілася нездарма:

— Штосьці не дагаворваеш…

— Хачу сказаць табе, што гэтае дзіва ты будзеш сузіраць праз кесаў дзевяноста.

— Нічога не зразумеў.

— Адразу відаць, што яшчэ слаба знаёмы з якутамі.

— Пазнаёміцца якраз паспеў, — Буза задумаўся, як больш даходліва патлумачыць.

Казак здагадаўся:

Фота з сайта yakutia.info.

Прыродны парк «Ленскія слупы».

— Асаблівага даверу пакуль не знайшоў?

— Праўду кажаш.

— Інакш яны сказалі б табе, што такое кес.

— І што гэта?

Цікавае паведаў казак. У якутаў была свая адзінка вымярэння. Правільней нават — двайнога вымярэння. Называлася яна кес. Тычылася і часу, і адлегласці. Адзін кес — гэта час, за які можна сабраць дровы. Развесці вогнішча, зварыць ежу. Пасля з'есці яе. Гэта займае прыкладна дзве гадзіны. Калі ж дзве гадзіны ісці, можна пераадолець каля дзесяці вёрст.

Елісей Юр'евіч хутка сарыентаваўся:

— Гэтыя скалы стаяць на беразе міль сто восемдзясят...

Праз колькі дзён цуд-скалы Буза ўбачыў. Яны стаялі не ў адзін рад, а мудрагеліста. І не самі па сабе. Сямтам узвышаліся над дрэвамі. У асобных месцах тайга адваёўвала прастору, адцясняла іх. Падступала да самага абрыву. Аднак так працягвалася нядоўга. Праз дзясятак-другі метраў чырвона-карычневая скала, расправіўшы плечы, адцясняла дрэвы. Свечкай узнімалася над імі. З яе бралі прыклад іншыя скалы.

Дрэў на беразе не заставалася. Скалы, скалы, скалы… Самых розных, нярэдка вычварных форм. Былі конусападобныя. Іншыя выступамі навісалі над вадой. У адным месцы выступ нагадваў вялізную галаву. Убачыўшы яе, Буза ажно здрыгануўся. Яму падалося, што нейкі велікан апусціўся да ракі — рыхтуецца прагавіта піць ваду.

— Тут, Юр'евіч, і не такое ўбачыш, — казак узіраўся ў бераг з такой зацікаўленасцю, быццам бачыў усё гэта ўпершыню. Як у пацвярджэнне сказанага зверху апусцілася… агромністая птушка. Праўда, не сапраўдная. Некалькі скал стаялі поруч так, што нагадвалі сабой яе распушаны хвост. Няцяжка ўявіць, якой велічыні, калі асобныя ўзніміліся над ракой больш як на 200 метраў.

Былі і скалы, падобныя на вежы, палацы. У адным месцы Буза не стрымаўся, ускрыкнуў:

— Няйначай скальны астрог!

Ён перажываў тое, што пазней дзекабрыст Аляксандр Бястужаў перадаў такімі словамі: «Какая-то святая тишина лежит на девственном творении, и душа сливается с дикою, но величественною природою». Адбываючы пакаранне ў Якуцку, Аляксандр Аляксандравіч пазнаёміўся і з гэтымі мясцінамі. Сёння «Прыродны парк "Ленскія слупы"» — аб'ект Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Да вусця Лены атрад даплыў за два тыдні. Яшчэ суткі спатрэбіліся, каб па Ледавітым моры дайсці да вусця ракі Алянёк. Па ёй дабраліся да качэўя тунгусаў. Іх абклалі ясаком. Сустрэўшы з боку качэўнікаў неблагое стаўленне, Буза зразумеў, што лепшага месца для зімоўя не знайсці. Таму і ўзяліся яго ўладкоўваць. З разлікам, што, магчыма, пазней тут з'явіцца астрог.

Заклаўшы зімоўе, аб'язджалі ваколіцы. Збіралі ясак, вывучалі мясцовасць. У зімоўі засталіся да вясны. Калі стала цёпла, на аленях вярнуліся на ніжнюю Лену. Спыніліся каля вусця яе левага прытока Маладо. Пабудавалі два кочы. На іх летам выйшлі ў мора. Пяць дзён плылі, шукаючы Ламу-раку. Па-тунгуску «лама» азначае мора. Не трэба блытаць з ракой Ламай у еўрапейскай частцы Расіі. «Тунгускую» Ламу яшчэ называюць Ахота.

Абагнуўшы мыс Буор-Хая, падарожнікі выйшлі ў Янскі заліў. Дасягнулі вусця ракі Яны. Па ёй тры тыдні падымаліся ўверх. Спыняліся, выходзілі на бераг, заўважыўшы качэўі тунгусаў і якутаў. Бралі ў іх ясак. Найперш сабалінымі шкуркамі і іншай «мяккай рухляддзю». Стаўленне да іх і тут было добрае. Набліжалася зіма, таму іншага месца для зімоўкі шукаць не сталі.

Зімой час марна не бавілі. Да сіберных марозаў ужо прывыклі. Калі крыху цяплела, браліся за сякеры, іншы сталярны рыштунак. Назапасілі нямала бярвенняў да надыходу халадоў: у час прыліваў іх выкідвала на бераг мора. Цяпер гэтыя таплякі апрацоўвалі, рабілі з іх кочы. Так пастараліся, што вясну сустрэлі з чатырма новымі лодкамі.

На іх і прадоўжылі знаёмства з Янскім залівам, які з вусця Яны цягнуўся на ўсход, дасягаючы «вялікага возера». Гэта была вялізная бухта. У заліў упадала рака Чандон. З боку мора яе «агароджваў» востраў Ярок.

Елісей Буза стаў не толькі першаадкрывальнікам гэтых геаграфічных аб'ектаў — ён першым напаткаў юкагіраў. Пра існаванне гэтага племені ў Расіі яшчэ не ведалі. Знайсці з імі хуткае паразуменне дапамог шаман. Невядома як, але ён прасякнуўся даверам да Елісея Юр'евіча, хоць ёсць і меркаванне, што быў Бузам падкуплены. Юкагіры ахвотна згадзіліся плаціць ясак. Не перашкаджалі ўзводзіць зімоўе.

Атрад затрымаўся ў гэтым месцы каля двух гадоў. Вывучалі быт, традыцыі юкагіраў. Пасля прадоўжыў пошук Ламы-ракі, але беспаспяхова. А вось невядомым да яго пралівам прайшоў.

Сярод юкагіраў Елісей Буза жыў да 1642 года. Па іншых звестках — да 1644-га. Пасля даставіў у Маскву сабраны ясак. Апошні раз згадваецца пад 1646 годам.

Хто ведае: магчыма, пасля прыезду адразу і памёр — пастаяннае знаходжанне на мяжы выжывання марна не праходзіць. А як нялёгка яму даводзілася, відаць, і з гэтай чалабітнай: «И будучи на твоей, государеве, службе, я, холоп твой, с теми служивыми и с промышленными людьми на Оленьке и на Яне, и на Чандоне реке принимали всякую нужу, ели коренне и траву, и душу сквернили всякою скаредною ядью, и голод и наготу терпели».

Фота з сайта goarctic.ru.

Юкагірская сям'я. 1902 г.

Выжыў, выстаяў. І застаўся ў гісторыі. Па сёння імя яго носіць правы прыток Ніжняй Лены. Незразумела толькі, чаму востраву Бузін вернута яго пачатковая назва Ярок. Тым больш дзіўна, што з карты знікла губа Бузіна. Тая самая безыменная бухта, адкрытая ім. Яе называюць яшчэ і губой. Як і іншыя залівы, якія ўразаюцца ў сушу. Спачатку далі ёй імя першаадкрывальніка. Пасля чамусьці перайменавалі ў губу Чандон.

Праліў, адкрыты Бузам, цяпер носіць імя Дзмітрыя Лапцева. Гэта ў гонар яго і яго стрыечнага брата Харытона колішняе Ледавітае мора ў 1935 годзе названа морам Лапцевых. Іх імёны прапісаны і ў іншых геаграфічных назвах. Па паходжанні браты Лапцевы таксама беларусы...

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Патух агмень Забароддзя



Сумныя навіны дайшлі да нас на мінулым тыдні з Вілейскага раёна. У сераду, 20 кастрычніка, на 74-м годзе жыцця ў іншы свет адышоў Барыс Цітовіч. Барыс Барысавіч — заснавальнік мемарыльнага комплексу памяці ахвяр Першай сусветнай вайны «Забароддзе», навуковы супрацоўнік Вілейскага краязнаўчага музея, таленавіты мастак, ілюстратар, іканапісец, лаўрэат прэміі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне» і кавалер ордэна Францыска Скарыны.

Жыццёвы шлях творцы пачаўся 28 чэрвеня 1948 года ў горадзе Коркіна (цяпер — Чалябінская вобласць, Расія). Праз нядоўгі час, у 1963-м, сям'я пераехала ў Беларусь. У дзяцінстве Барыс марыў стаць ваенным, як яго бацька, але пасля смерці родзіча па волі маці скончыў спачатку мастацкую школу ў Маладзечне, а потым і факультэт кніжнай графікі Беларускага дзяржаўнага тэатральна-мастацкага інстытута. Мастацтву графікі будучага ілюстратара навучалі такія вядомыя дзеячы, як Павел Любамудраў, Васіль Шаранговіч.

У 1970—1980-я Барыс Барысавіч працаваў у выдавецтвах «Беларусь» і «Мастацкая літаратура», займаўся ілюстраваннем кніг. Ім створаны малюнкі прыблізна да двух дзясяткаў выданняў беларускіх пісьменнікаў, сярод якіх — творы Івана Шамякіна, Віктара Казько, Івана Навуменкі, Янкі Брыля, Петруся Броўкі і многіх іншых. За ілюстрацыі 1973 года да раманаў Івана Мележа «Людзі на балоце» і «Подых навальніцы» Барыс Цітовіч быў узнагароджаны дыпломам II ступені на Усесаюзным конкурсе «Мастацтва кнігі» (1975 год, Масква).

У 1974 годзе творца разам з жонкай Валянцінай, рэжысёрам па адукацыі, вырашае перабрацца ў вёску Забароддзе Вілейскага раёна Мінскай вобласці. З марай стварыць тут свайго роду сядзібу мастакоў пара пачынае добраўпарадкоўваць тэрыторыю вакол іх новага дома. Пазней гэтае захапленне перарасце ў сапраўдную справу жыцця. У той жа перыяд Цітовіч стварае некалькі графічных серый, прысвечаных ваеннай і вясковай тэмам: «Памяці Брэста» (1975), «Мае аднавяскоўцы» (1982), «Сялянскі накцюрн» (1983) ды некаторыя іншыя.

Апошняе дзесяцігоддзе мінулага веку азнаменавалася для Цітовічаў удзелам у стварэнні Музейнага комплексу старажытных народных рамёстваў і тэхналогій «Дудуткі». Намаганнямі творчага саюзу былі абсталяваны майстэрня, сталярны і ганчарны цэхі, пякарня, адрэстаўрыравана кузня. Не перапынялася, аднак, і работа па ўпарадкаванні вёскі Забароддзе. Дзякуючы старанням мастака былі адноўлены навакольныя могілкі з пахаваннямі часоў Першай сусветнай вайны, створана экспазіцыя прадметаў традыцыйнага беларускага быту, захаваны многія вясковыя пабудовы, узведзена Барыса-Глебская капліца.

Вынікам шматгадовай руплівай працы па аднаўленні памяці стала стварэнне ў 2000-я гады ў межах вёскі мемарыяльнага комплексу «Памяці падзей Першай сусветнай вайны на Вілейшчыне». Адмысловы запаведнік традыцыйнага ладу жыцця і ўражальны музей Вялікай вайны, гэты комплекс стаў найвялікшым дасягненнем Барыса Цітовіча ў жыцці і разам з тым — адным з найцікавейшых мемарыялаў у краіне.

Мікіта ШЧАРБАКОЎ

Ён цалкам даверыўся волі Бога

Позна ўвечары 22 кастрычніка памёр паэт Георгій Іванавіч Кісялёў, які больш за трыццаць пяць гадоў жыў і працаваў у Ваўкавыску. Апошні месяц вельмі пакутаваў, ляжаў у бальніцы, з кожным днём слабеў, пераліванне крыві і плазмы ўжо не дапамагала…

Мой старэйшы таварыш па літаратурным цэху — мудры, ціхі, сціплы чалавек, таленавіты і недаацэнены паэт. Свой апошні аўтарскі зборнік «Поединок. Избранное» (2019) Георгій Іванавіч выдаў за ўласны кошт. Кісялёў не ўмеў дамагацца чагосьці для сябе, павышаць голас, расштурхваць іншых. Але ў сваіх крытычных аглядах сучаснай паэзіі, якія ахвотна публікаваў часопіс «Нёман», раптам станавіўся суровы, бязлітасны да халтуры, не шкадаваў паэтаў, калі бачыў нядбайную працу са словам, няўдалую рыфму.

Мы падоўгу размаўлялі па тэлефоне, галоўным чынам пра літаратуру, рэдка спрачаліся, разбіралі па радках вершы, шукалі ў іх залатое зерне, але больш іранізавалі над няўмельствам некаторых вершапісцаў.

Георгій Іванавіч многаму мяне навучыў: не мітусіцца, не забягаць наперад, не спяшацца з публікацыяй, быць патрабавальнай да сябе і бясконца шліфаваць літаратурную мову.

Да юбілею паэта ў 2019 годзе часопіс «Нёман» шчодра адвёў для інтэрв'ю з Георгіем Іванавічам больш чым 20 старонак. Гутарка аб мінулым, дзяцінстве, каранях, лёсах таленавітых паэтаў яго пакалення атрымалася шчырай і адкрытай.

«Памятаеце, як у Мікалая Ушакова: «Чем продолжительней молчанье, тем удивительнее речь». Гэтае рашэнне яшчэ больш умацавалася

ўва мне, калі я далучыўся да веры сваіх дзядоў і прадзедаў. Я ўвогуле перагледзеў стаўленне да сваёй творчасці, убачыўшы ў ёй пажыўнае асяроддзе для ўзрастання ўва мне ганарыстасці. І я не жадаю сілкаваць яе ні тыражамі, ні пахваламі ў друку, ні мітуснёй на паэтычных тусоўках. Я цалкам даверыўся волі Бога ў адносінах да лёсу маёй кнігі. Тое, што патрэбна Богу, не знікне. А тое, што не трэба, няхай знікае…»

Апошняе пісьмо прыйшло 20 верасня: «Ірына Сяргееўна, усё гэта цяпер я бачу праз прызму сваёй хваробы, якая са мной вельмі жорсткая. На коне маё жыццё. Дзякуй Вам за наша сяброўства. Г. І.».

Ірына ШАТЫРОНАК

Калектыў Гродзенскага абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі глыбока смуткуе з прычыны смерці члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, члена Саюза пісьменнікаў Саюзнай дзяржавы, паэта, перакладчыка, публіцыста Георгія Іванавіча КІСЯЛЁВА і выказвае шчырыя спачуванні яго родным і блізкім.

Глядзеў у заўтра — і не баяўся

Памёр пісьменнік Юры Станкевіч… Мы пазнаёміліся ў студзені 2004-га пасля выхаду маёй рэцэнзіі ў «ЛіМе» на яго аповесць у «Полымі». Неяк вечарам раздаўся званок. Да сённяшняга часу памятаю басавітае «Спадар Сяргей, гэта Юры Станкевіч...» Я збянтэжыўся: нейкаму маладому літаратару тэлефанаваў сам мэтр! Думаў, будзе папракаць за крытыку ў яго адрас, а ён, наадварот, падзякаваў... З таго часу завязалася шчырае і ўзаемапаважлівае знаёмства. Ён друкаваў творы, а я пісаў рэцэнзіі на іх. Адну, другую, трэцюю... Пры гэтым мяне заўсёды ўсцешвала, што масціты пісьменнік прыслуховаўся да майго меркавання і нават уносіў праўкі ў творы пасля заўваг.

За час нашага знаёмства мы бачыліся, здаецца, усяго двойчы ў Мінску. У астатні час «сустракаліся» на старонках яго твораў, апублікаваных у «Маладосці», «Полымі», «Настаўніцкай газеце»… Ён часта запрашаў у госці ў Барысаў, дзе жыў. Я абяцаў прыехаць, але так і не выбраўся. І ўжо не прыеду. Не паспеў. Так бывае ў жыцці...

Апошні раз размаўлялі па тэлефоне дзесьці паўтара тыдні таму... Хто тады, апроч Усявышняга, ведаў, што апошні... Цяжка паверыць, што больш ніколі не пачую яго чарговае басавітае прывітанне... Затое назаўсёды запомню першае...

Да ўспрымання-разумення надзвычай востраплемнай і актуальнай прозы гэтага адметнага аўтара трэба, як кажуць, дарасці. Некаторыя вядомыя даследчыкі яго творчасці адразу заўважылі ў ёй заклапочаны позірк, скіраваны ў будучыню ўсяго чалавецтва.

У пастаноўцы і мастацкім вырашэнні глабальных пытанняў пісьменнік апярэджваў агульнае развіццё сучаснай беларускай літаратуры, з-за чаго займаў ў ёй



асобнае, канкрэтна не вызначанае месца. Адсюль і частае неразуменне, непрыманне яго творчасці, якая засцерагае насельнікаў планеты ад далейшага няправільнага жыцця, спрошчанага да жывёльных інстынктаў.

Гэта аўтар з выразнай грамадзянскай пазіцыяй, незалежнай ад хуткаплыннай кан'юнктуры часу. Нельга папракнуць Ю. Станкевіча і ў прыстасавальніцтве да знешніх абставін, якімі б яны ні былі.

Мастацкія прыёмы пісьменніка пазбаўлены паліткарэктнасці, а погляд на чалавека далёкі ад веры ў яго розум і ўяўныя звышмагчымасці. Менавіта праз падобнае ўспрыманне непрычасанай рэчаіснасці ён бачыцца літартадоксам сацыяльна нявыгадным і нават шкодным, гэткім антыгуманістам, што бязлітасна руйнуе пяром зманлівыя ідэалы віртуальна-ружовай будучыні. Але Ю. Станкевіч у сваёй мадэлі свету паслядоўны і бескампрамісны да банальнага, бо грунтуе яе на звычайных прынцыпах чалавечай маралі і годнасці, вымяраючы імі вартасць кожнага з нас.

Ён увайшоў у літаратуру даволі позна, але з ужо сфарміраваным светапоглядам і яснай творчай канцэпцыяй, якая дакладна адлюстравана амаль у кожным апавяданні, аповесці, рамане. У іх няма лакальнага прымітывізму, яны выходзяць за межы традыцыйна-вясковага побыту і скіраваны на глабальныя праблемы сучаснага грамадства, чым і прыцягальныя.

Паміж першай і апошняй па часе выхаду кнігамі Ю. Станкевіча — каля 30 гадоў. Для творчай біяграфіі гэта няшмат. Дарога ад «Лупу» (1989) і «Анёлаў на бальшаку» (1993) да кніг «Апладненне ёлупа» (2005), «Мільярд удараў» (2008), «П'яўка» (2010), «Шал» (2012), «Брамнік заўжды самотны» (2014), «Паўночны вецер для спелых пладоў» (2015) і іншых пазначана нястомнымі пошукамі свайго месца ў свеце і ідэнтыфікацыяй сябе як асобы. Паміж гэтымі выданнямі стаяць не менш важныя: «Любіць ноч — права пацукоў» (2000), «Армагедон — 1895» (2000) і «Сатырыкон» (2003). Першае з іх фактычна абумовіла ідэйны настрой усёй далейшай прозы пісьменніка. Так, магістральны раман «Любіць ноч — права пацукоў» знайшоў своеасаблівы працяг у антыўтопіях «Эрыніі» і «П'яўка», якія не маюць аналагаў у айчыннай літаратуры. Кожная наступная ўдакладняе і дапаўняе папярэднюю, сведчыць пра пастаянны рух мастацкай свядомасці і абвостранае адчуванне трывожнага пульсу часу.

У большасці твораў Ю. Станкевіч не пакідае ніякіх шансаў чалавеку на выратаванне. Але гэта заканамерна: духоўныя спусташэнцы і звыродлівыя псеўдапатрыёты гістарычнай будучыні не маюць. Нягледзячы на неспрыяльныя жыццёвыя абставіны і няспынныя паразы лёсу, персанажы пісьменніка да апошняга трымаюць абарону ўласных прынцыпаў, без чаго не пачуваюць сябе паўнавартаснымі прадстаўнікамі чалавечага роду ў цэлым і сваёй нацыі ў прыватнасці. Нават у фантастычных творах, дзе аўтар, грунтуючыся на навуковых даследаваннях, сцвярджае, што наш сусвет — усяго толькі дэкарацыя, гучыць голас у абарону чалавечага ў чалавеку, адчуваецца надзея на перамогу дабра і справядлівасці, праўды і маралі, натуральнай логікі прыроды... Пісьменнік вядзе непрымірымую барацьбу з псеўдай (знешняй і ўнутранай), ілжыва-падманнымі дэкарацыямі.

У творчым багажы пісьменніка шмат адметных апавяданняў, у якіх даследуюцца сутнасць фізічных магчымасцей чалавека, межы яго падзення, а таксама прырода страху, псіхалагічных адхіленняў, грамадскіх катаклізмаў і экстрэмальных будняў, дзе пастаянна даводзіцца адстойваць права на жыццё, нават з незайздросным фіналам.

Юры Станкевіч не баяўся глядзець ні ва ўнутраны свет чалавека, які не ў стане адшукаць паратунак ад самога сябе, ні наперад, у аддаленую перспектыву, што, дзякуючы недасканалай людской натуры, не абяцала нічога прыемнага. Абвастраючы жыццёвыя канфлікты, пісьменнік абвастраў наша разуменне навакольнай рэчаіснасці, наканаванага і непазбежнага, чаму хоць і бессэнсоўна супрацьстаяць, але неабходна — дзеля годнага апраўдання сваёй часовай зямной прысутнасці. Таму давайце разам з гэтым цікавым аўтарам смела глядзець у заўтра, якое з'яўляецца праекцыяй кожнага з нас, стваральнікаў штучных багоў і дэкарацый.

Сяргей ГРЫШКЕВІЧ

Простыя рэчы

Сімвалы вечнасці ды мудрасці

Пісьменнік, даследчык, перакладчык Юры Кур'яновіч яшчэ і малюе. Неаднойчы арганізоўваліся яго персанальныя выстаўкі. У работах уражвае мноства дэталей, адсылак, сімвалаў — яны як бы напластоўваюцца на асноўны сюжэт твораў, засмоктваючы ў бездань сваіх значэнняў і варыянтнасць вытлумачэнняў. Сённяшняя размова — пра няяўны бок рэчаў і з'яў, што хаваецца за фасадамі звыклага для ўспрымання.

Фота з асабістага архіва Ю. Кур'яновіча.

— Юра, чаму ўсё ж ты не звязаў свой лёс з прафесійным мастацтвам?

— Пасля школы нават і не думаў аб прафесіі мастака, не разглядаў яе як магчымую. За плячыма былі толькі ўрокі малявання і чарчэння сярэдняй школы на выдатна. Стос аматарскіх малюнкаў: аловак, фламастар, акварэль. Потым вучыўся па кнігах, у мастакоў... Сапраўднае захапленне жывапісам прыйшло толькі на пачатку 1990-х, першая алейная карціна (вечаровы краявід) з'явілася ў 1992 годзе.

З іншага боку, калі б адразу пайшоў па дарозе прафесійнага мастацтва, можа, праз пэўны час і развітаўся б з ім. Трэба было адчуць, спазнаць жыццё, як кажуць, у іншым вымярэнні і толькі потым паспрабаваць увасобіць яго праявы, дух, гукі на палатне... Такіх прыкладаў шмат. Сярод мастакоў ёсць самабытныя творцы, якія ўзбагацілі сусветнае мастацтва, напрыклад: Ван Гог, Поль Гаген, Анры Русо, Ніко Пірасмані, Айм Катаяйнен... Можна згадаць і сучаснікаў Алега Буйко, Тамару Масленік, Яўгена Сасюру, творчасць якіх набыла шырокую вядомасць. Да творчасці не ў класічным фармаце падштурхнуў Мікола Селяшчук — як ні дзіўна, адчуў у яго работах водгук маёй прозы, агулам, майго майго светаадчування. Шлях мастака вельмі цяжкі, непрадказальны, і толькі той творца дасягае сапраўднага поспеху і прызнання, хто аддана і самаахвярна служыць мастацтву.

— Як бы ты вызначыў стыль сваіх работ?

— Я проста малюю тое, што мяне хвалюе і што, упэўнены, будзе хваляваць і цікавіць людзей заўсёды. Сказаць пра вечнае па-свойму — вось асноўнае крэда мастака, менавіта ў гэтым яго вартасць.

Мае карціны — шматгранная палітра адценняў, фарбаў, пэўных рэчаў, аб'ектаў (у прыватнасці дойлідства), геаметрычных фігур і... бязмежнасці ў часе... Усё прасякнута беларускімі матывамі. Прынамсі, імкнуся да гэтага. Квінтэсэнцыя — філасофская задуменнасць над існасцю. У маім жывапісе можна знайсці элементы сюррэалізму, імпрэсіянізму, авангардызму...

Пакуль не скончу карціну, ніколі не ведаю дакладна ў дэталях, як яна ў выніку будзе выглядаць. Ёсць агульная задума, сюжэт. Але ў працэсе замест задуманага аб'екта можа з'явіцца яго «пабрацім».

— На тваіх карцінах шмат сімвалаў. І гэта невыпадкова…

— Калі казаць пра сімвалы, то яны ўвогуле шырока выкарыстоўваюцца ў мастацтве, асабліва ў жывапісе. Ці не ўсе мастакі звяртаюцца да сімволікі фарбаў. Я б сказаў, што сімвалы — гэта філасофія карціны. А якая філасофія без алегорый? Сімвал звяртаецца да розуму, падсвядомасці, пачуццяў. Ён прымушае не толькі атрымліваць эстэтычнае задавальненне ад напісанага на палатне, але і супераживаць і думаць. Напрыклад, самая мая вялікая карціна «*Credo ut intelligam*» — прыблізна 1,20 м × 0,9 м — самая эпічная і сімвалічная. Тут дакументальныя рэчы. Зорнае неба — дакладная копія з аднаго кітайскага храма. У ніжнім куце — радкі са старажытнаіндыйскага трактата пра чысло «пі». Лямпа — з маёй кватэры. У святле лямпы — работы Мікеланджэла «Прарок Ерамія» і «П'ета». Нясвіжскі касцёл. А таксама — хлеб, цыбуля і яйка, у якіх я ўвасобіў сімвалы жыцця, міру і мудрасці.

«*Credo ut intelligam*».

Чырвоная фігура на палатне «Роздум» — увасабленне пятлі Мёбіуса — пазнака аднабаковасці нашай рэчаіснасці. Восеньскае лісце ў парыве ветру — як роздум, як неспакойныя думкі, якія не пакідаюць свядомасць: а ці не аднабакова мы ўспрымаем тое, што напісана ў Евангеллі? А вось палітра фарбаў у куце карціны трактуе маё ўласнае разуменне Бібліі: белае — тая частка, якую я ўспрымаю ад «А» да «Я», іншая частка — у розных колерах.

Ёсць геаметрычная фігура — дадэкаэдр — і на рабоце «Спрадвечнае». Яна сімвалізуе сусвет. Дзве палавінкі яблыка — дзве палавінкі цэлага, якія шукаюць адна адну. Выяўлены касцёл — увасабленне рэлігійнасці, як значнага фактару ў жыцці чалавецтва, у прыватнасці духоўнага жыцця. На беразе мора — жанчына, якая кудысьці ўглядаецца — хоча ўбачыць каханага і адначасова зразумець існасць гэтага свету. Унізе палатна — словы з Евангелля: «Бо хто хоча душу сваю ўратаваць, той страціць яе». Напэўна, нельга захаваць душу як суцэльны нязменны кавалак чагосьці. Калі вы кахаеце, то частку сваёй душы аддаяце каханай. Калі ў вас ёсць любімая работа, то частку сваёй душы вы ўкладаеце ў яе. Спрадвечныя пошукі…

Гутарыла Таша ШПАКОЎСКАЯ

зваротная сувязь

Азірнуцца на парозе будучыні

Праграма «Літаратурная анталогія» на канале «Культура» Беларускага радыё прапануе працяг рамана Георгія Марчука «Крык на хутары». У «Радыёбібліятэцы» гучыць твор Уладзіміра Караткевіча «Дзікае паляванне караля Стаха». У эфіры выхадных апавяданні беларускіх і замежных аўтараў, як звычайна, чакаюць слухачоў у праекце «Літаратурныя гісторыі», а для аматараў паэзіі выходзіць праграма «Прачулым радком», якая гэтым разам прапануе вершы Алеся Ставера.

Змест праграмы «Радыётэатр плюс» у суботу і нядзелю складуць радыёспектаклі «На парозе будучыні» і «Вяртанне ў маладосць» паводле твораў Міколы Лобана (да 110-годдзя з дня нараджэння пісьменніка).

Прыхільнікам дзіцячага радыётэатра канал «Культура» ў суботу і нядзелю ў 10.05 прапануе пастаноўкі, што захоўваюцца ў фондах Беларускага радыё. Чытанні для маленькіх ладзяцца па буднях у межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя». У гэтыя дні гучаць старонкі твора Паўла Міско «Эрпіды на планеце Зямля». Штовечар у 21.00 выходзіць «Вячэрняя казка» для маленькіх.

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з літаратурнымі падзеямі і навінкамі беларускіх выдавецтваў, а таксама са зместам свежага нумара штотыднёвіка «ЛіМ».

У нядзелю ўвазе слухачоў — праект Навума Гальпяровіча «Сюжэт для вечнасці». Госць эфіру радыёверсіі праграмы «Суразмоўцы», што гучыць у нядзелю і сераду, — паэт Алесь Бараноўскі.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач канала «Культура» даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

ЛіМ КАЛЯНДАР

30 кастрычніка 85-годдзе адзначае Генадзь Цыхун, мовазнавец.

31 кастрычніка — 150 гадоў з дня нараджэння Мікалая Папова (1871—1949), расійскага рэжысёра, драматурга, заслужанага артыста РСФСР. У 1925—1926 гг. мастацкі кіраўнік БДТ-1.

31 кастрычніка — 90 гадоў з дня нараджэння Тамары Шашкінай (1931—2018), актрысы, заслужанай артысткі БССР.

31 кастрычніка — 85 гадоў з дня нараджэння Івана Хоміча (1936—1992), скульптара.

31 кастрычніка 75 гадоў спаўняецца Святаславу Федарэнку, жывапісцу.

1 лістапада 80-гадовы юбілей адзначае Аляксандр Бецеў, кінааператар.

4 лістапада — 115 гадоў з дня нараджэння Аляксандры Нікалаевай (1906—1997), артысткі балета, педагога, народнай артысткі БССР.

4 лістапада — 205 гадоў з дня нараджэння Арцёма Вярыгі-Дарэўскага (1816—1884), паэта, драматурга, публіцыста, удзельніка паўстання 1863—1864 гг.

5 лістапада — 105 гадоў з дня нараджэння Мікалая Маліноўскага (1916—1991), акцёра, заслужанага артыста БССР.

5 лістапада — 95 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Якутава (1926—2010), публіцыста, празаіка.

5 лістапада 50-годдзе святкуе Юрый Болахаў, акцёр.

* * *

130 гадоў таму нарадзіўся Іван Цвікевіч (1891—1938), грамадскі дзеяч, выдавец, публіцыст.

Выходзіць з 1932 года

ЛіМ

Заснавальнікі:
Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар
Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Таццяна Арлова, Алесь Бадак, Дзяніс Барсукоў, Віктар Гардзей, Уладзімір Гніламёдаў, Вольга Дадзіёмава, Жана Запартыка, Анатоль Казлоў, Анатоль Крэйдзіч, Віктар Кураш, Алесь Марціновіч, Вячаслаў Нікіфараў, Мікалай Чаргінец, Іван Чарота, Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі:
Юрыдычны адрас:
220013, Мінск,
вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі:
220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны:
галоўны рэдактар — 325-85-25
намеснікі галоўнага рэдактара — 319-79-85, 224-66-74
адказны сакратар — 377-99-73
аддзел крытыкі і бібліяграфіі — 317-20-98
аддзел прозы і паэзіі — 317-20-98
аддзел мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы:
63856 — індывідуальны;
63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў;
638562 — ведамасны;
63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец:
Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"».
Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк
28.10.2021 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 660

Друкарня Рэспубліканская ўнітарнага прадпрыемства «Выдавецтва «Беларускі Дом друку»
ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004
г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013
Заказ — 2638

Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца.
Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый.
Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686

9 770024 468001 21043